ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 114 (496) Аўторак, 11 кастрычніка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Ніводнага опозіцыянэра ў комсамоле.

(Рэзолюцыя Пленуму ЦК ЛКСМБ па дакладу тав. Кнорына аб выніках апошняга Пленуму ЦК КП(б)Б).

1. Пленум ЦК ЛКСМБ, заслухаўшы і абгаварыўшы даклад тав. Кнорына аб выніках апошняга Пленуму ЦК КП(б)Б, далучаецца цалкам і поўнасьцю да ўсіх яго рашэньняў.

Пленум ЦК ЛКСМБ констатуе, што опозіцыя сваімі фракцыйнымі дзеямі адышла ад вучэньня Леніна, узяла напрамак на ўтварэньне новай трацкісцкай партыі (організацыя падпольнай друкарні, адмаўленьне ад сваіх заяў аб падлегласьці рашэньням партыі, супрацоўніцтва з выключанымі з Камінтэрну Рут-Фішэр, Маславым. Урбансам, Суварыным і г. д).

Пленум ЦК ЛКСМБ вітае пастановы організацый партыі аб выключэньні з УсеКП опозіцыянэраў, вядучых фракцыйную работу і рашэньне Выканкому Камінтэрну аб выключэньні Троцкага і Вуйовіча з ВККІ.

Пленум ЦК заклікае ўсю комсамольскую організацыю БССР яшчэ шчыльней згуртавацца навакол бальшавіцкай партыі супроць раскольнікаў партыі, з падвойнай энэргіяй выконваць усе задачы партыі.

2. Напружанасьць міжнароднага становішча, небясьпека вайны супроць СССР патрабуе ад комсамолу напружанасьці ўсіх сіл у галіне разгортваньня работы па ваенізацыі мас комсамолу, беспартыйнай рабоча-сялянскай моладзі. ПАТРЭБНА, ЯК НІКОЛІ, ШЧЫЛЬНАЯ СУВЯЗЬ З ТСА-АВІАХІМАМ З ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ. Пастанову ЦК УсеЛКСМ аб абавязковым вайсковым навучаньні комсамольцаў павінна быць выканана ПА БАЯВОМУ, ОРГАНІЗАВАНА Ў ДАКЛАДНА ВЫЗНАЧАНЫЯ ТЭРМІНЫ.

3. Рашэньні XIV партзьезду ў адносінах да комсамолу павінны з удзесяцяронаю сілаю, з найбольшай поўнасьцю праводзіцца ў жыцьцё.

Асобныя зьявішчы ў жыцьці комсамолу, як зьявішчы недысцыплінаванасьці, расхлябанасьці, адсутнасьць у некаторай частцы актыву ўпартасьці, настойлівасьці пры давядзеньні справы да канца, асобныя выпадкі праяўленьня мяшчанскага індывідуалізму, некаторы рост антысэмітызму і асобных выпадкаў праяўленьня расійскага і беларускага шовінізму,—усё разам узятае ставіць ва ўвесь рост задачу барацьбы з імі. Гэтыя асобныя зьявішчы асабліва рэзка падкрэсьліваюць задачу ДЫСЦЫПЛІНАВАНАГА ПРОЛЕТАРСКАГА КІРАЎНІЦТВА Ў КСМ, што значыць—асабліва ўзмацнёна працаваць над 100 проц. уцягненьнем рабочае моладзі ў КСМ, над пытаньнем суадносін паміж рабочай і сялянскай часткай саюзу; пытаньне аб партасяродку, кіраўніцтве партыі і кіраўніцтве ЛКСМ над піонэрскімі організацыямі. „Больш чым калі-б то ні было, комсамол павінен орыентавацца на масы, у першую чаргу на масы рабочае моладзі“. Гэта паказаньне XIV партзьезду павінна ў бягучы момант асабліва глыбока пранізваць усю работу комсамолу.

4. Вайсковая небясьпека суразьмерна ўзмацняе важнасьць задачы гаспадарчага будаўніцтва: Дырэктывы партыі і ЦК ЛКСМБ па гаспадарчаму будаўніцтву павінны дасканальна і акуратна выконвацца. Лёзунг—„Удзел у гаспадарчым будаўніцтве—ёсьць стрыжань работы комсамолу“—застаецца такім-жа базавым, як і ў пачатку яго пастаноўкі.

5. Улічваючы, што опозіцыя перад XV партзьездам выступіць з усёй сваёй сілай супроць лініі партыі, супроць лініі Ленінскага ЦК УсеКП, задача комсамолу разгарнуць найшырэйшую работу па растлумачэньні і прапрацоўцы, па ўцямленьні масамі комсамолу лініі партыі. Нашыя лёзунгі: Ніводнага опозіцыянэра ў комсамоле, сакрушыцельны адпор усякім опозіцыйным вылазкам у шэрагах комсамолу. Усіх да аднаго сяброў комсамолу згуртаваць навакол Ленінскай партыі і яе ЦК УсеКП(б).

Пятая гадавіна шэфства.

Работа па шэфстве над флётам у нас мае адзін недахоп: яна заўсёды носіць адзнаку нейкай «кампанейскасьці».

Калі падыходзіць які небудзь шэфскі сьвяточны дзень—пачынаюць варушыцца організацыі. Няма сьвята—няма і работы.

Сталасьцю, увязкай гэтай галіны работы ня могуць пахваліцца амаль што усе комсамольскія організацыі Беларусі.

Толькі Віцебск і часткаю Бабруйск сваечасова ўносяць шэфскі ўзнос. Астатнія організацыі, відаць, чакаюць сьвята. А між тым, у пастановах ЦК УсеЛКСМ падкрэсьлена: «...**Непаслабная ўвага комсамолу і ўсіх працоўных да запатрабаваньняў Чырвонага флёту і штодзенны ўдзел у будаўніцтве савецкай марской абароны створаць надзейнага, неперможнага вартаўнічага мароў і берагоў Савецкага Саюзу**».

Вось гэтай якраз «**непаслабнай увагі**» у нас і не прыкмячаецца.

16-га кастрычніка спаўняецца пяць год са дню прыняцьця комсамолам шэфства над Чырвоным флётам.

За гэты час комсамол, наогул, зрабіў шмат для паляпшэньня якасьці асабістага складу флёту: шэфства комсамолу Беларусі над адным з найбольш магутных караблёў Бальтыцкага флёту—лінкорам імя «Парыскай Комуны»—адчуваецца.

У часе прыняцьця шэфства падкрэсьлівалася, што комсамол зьяўляецца ня толькі шэфам, але і будаўніком марского флёту Савецкага Саюзу. У матар'ялах марского ведамства адзначаецца: «...Мы можам сказаць, што шэфства комсамолу над Чырвоным флётам мела і мае рашучае значэньне ў будаўніцтве савецкае марское сілы. Бяз удзелу комсамолу, без падтрыманьня нашай комуністычнай партыі і рабочай клясы немагчыма было-б узьняць Чырвоны флёт з таго становішча, у якім ён апынуўся ў 1921 годзе ў выніку блёкады і чужаземнай інтэрвэнцыі.

Жыцьцёвыя інтарэсы СССР упарта патрабуюць стварэньня моцнага ваеннага і гандлёвага флёту. Зноў прыходзіцца напамінаць, што 2/3 ўсіх межаў выходзяць да мора, што каля 90 проц. нашага надворнага грузазвароту ідзе морам, што ва моры і ў прыморскіх раёнах наша краіна мае вялізарнае багацьце.

Шэфства замацавана, праводзіцца лепш, чым у папярэднія гады, але горш, чым гэтага патрабуе жыцьцё.

У дні, калі адзначаецца пятая гадавіна шэфства, яшчэ раз перагледзім якасьць нашай шэфскай работы.

У дні, калі вайсковая небясьпека з боку капіталістычных драпежнікаў яшчэ ня мінула—узмацненьне шэфства над флётам зьявіцца ўзмацненьнем абараназдольнасьці краіны, абароны марскіх межаў СССР.

Праз 5 дзён.

Чым адзначыць юбілей.

15-га кастрычніка—5-ая гадавіна комсамольскага шэфства над флётам.

Гэты юбілей сёлета праводзіцца пад наступнымі лёзунгамі:

— Узмацніць абараназдольнасьць краіны.

— Растлумачыць шырокім масам рабоча-сялянскай моладзі значэньне і ролю Чырвонага флёту ў справе абароны СССР.

— Узмацніць штодзённую сувязь камсамолу з флётам і рэгулярна дапамагаць яму.

— Няма ніводнай ячэйкі, якая запазычылася Чырвонаму флёту і ня трымае з ім сталай сувязі.

* * *

Што можна рэкамэндаваць ячэйкам у якасьці конкрэтных мерапрыёмстваў па правядзеньні 5-й гадавіны комсамольскага шэфства над флётам.

Неабходна тэрмінова правесьці збор грошай, згодна развёрстцы акругкому; сабраць ад камсамольцаў падарункі і лісты чырвонафлётцам.

Асабліва рэкамэндуецца правядзеньне ячэйкавых вечароў, прысьвечаных шэфству над флётам з інформацыяй аб становішчы апошняга, чытаньнем флёцкіх лістоў і спэцыяльна падабраным концэртным аддзяленьнем.

Клюбам і юнсэкцыям належыць падрыхтаваць платныя вечары, кіно-сэансы і іншыя масавыя мерапрыемствы на карысьць чырвонафлёцкага фонду.



„ЭХ, ВЫ, ПЛЯНЫ, ПАСТАНОВЫ!..“

ПЕРАВЫБАРЫ БЮРО ЯЧЭЕК—ПРАВЕРКА НАШАЙ РАБОТЫ.

„У комсамоле, як у электрычнай праводцы, патрэбна зазямленьне—патрэбна цесная сувязь тысячамі правадоў з усёй моладзьдзю“.

Асушым папяровыя балоты.

Сёньня мы прыводзім шэраг фактаў, якія гавораць аб тым, што з кіраўніцтвам масай комсамольцаў у нас справа абстаіць не паўсюды як сьлед. Куды ні глянеш, дык сустрэнеш узрастаючую актыўнасьць моладзі, жаданьне вучыцца, працаваць, перакройваць жыцьцё, вытворчасьць, быт.

Гэты творчы энтузіязм мас зьяўляецца асновай нашага будаўніцтва, нашых посьпехаў: цьвік усіх пытаньняў—у кіраўніцтве. Організацыі трэба такое



кіраўніцтва, якое-б чула падхоплівала ініцыятыву глыбокіх нізоў організацыі, паказвала-б шляхі, надавала натхненьня моладзі на конкрэтныя справы.

У комсамоле, як у электрычнай праводцы, патрэбна зазямленьне. Патрэбна цесная сувязь тысячамі правадоў са ўсёй моладзьдзю. У праціўным выпадку ўся устаноўка сапсуецца, жывы электрычны ток не пацячэ па комсамольскіх жылах.

Хутка перавыбары бюро ячэек, неабходна, бязумоўна, цяпер пагаварыць аб ячэйковым кіраўніцтве, кіраўніцтве нізавога апарату—бюро ячэйкі.

Шлях комсамольскай дырэктывы.

Цяжкі шлях комсамольскай дырэктывы. Цяжкі шлях яе ад акругкому да райкому, ад райкому да ячэйкі. Але самы цяжкі вучастак шляху ад бюро ячэйкі да комсамольцаў.

Пры праверцы рагачоўскім райкомолам выкананьня дырэктыў ячэйкамі, выявіліся цікавыя факты. Большасьць ячэек ня выконваюць дырэктыў.

У частцы ячэек аб дырэктывах РК акрамя сакратара ячэйкі ніхто ня ведае. Калі прыходзіць дырэктыва ў ячэйку вёскі Ціханцы, сакратар ячэйкі кажа:

Прышый да спраў!

Дырэктывы вельмі часта не прыстасоўваюцца да ўмоў ячэйкі, прымаюцца «да ведама». У ячэйцы вёскі Старое Сяло, Блізьняцы—атрымалі пастанову пленуму аб васеньняй пасяўной кампаніі і коопэраваньні сялянскай моладзі—парашылі прыняць да ведама.

Па дакладу старшыні праўленьня коопэрацыі, ячэйка вёскі **Блізьняцы** ўхваліла: «**Заслухаўшы даклад аб коопэрацыі, мы, комсамольцы і беспартыйная моладзь, уцямілі мэты і задачы коопэрацыі, што праз коопэрацыю можна здабыць усе тавары. Мы, ячэйка КСМ адзначаем недахопы нашай коопэрацыі ў вёсцы Блізьняцы**». Вось і ўся рэзолюцыя. А аб тым, што коопэрацыя прадае тавары даражэй, чым прыватнік, аб тым, што **дрэнны там падбор асортымэнту тавараў** (аб гэтым гаварылі ў спрэчках па дакладу), ячэйка ні слова не сказала.

Прывычка—чакаць цыркуляру, не заглядаць у газэту, дзе ёсьць шмат добрага вопыту, распаўсюджана сярод актыву Вітлінскай, Гадзілавіцкай, Блізьнецкай ячэек Рагачэўшчыны.

Ініцыятыва ў тупіку.

Шматлікія, часта некарысныя пасяджэньні, мора «узгадненьняў», «увязак»—часта замяняюць творчую працу бюро ячэйкі. У такіх выпадках мы ня бачым падтрымкі ініцыятывы ідучай з нізоў. Наадварот, ініцыятыва заходзіць у тупік, сустракаючы глухую сьценку цяганіны, фармалізму і казёншчыны.

Зноў вёска Блізьняцы. Бачылі комсамольцы, як комсамолец Старадаўтаў Янка і яшчэ другі, гналі і пілі самагон. Сяляне коса пaглядалі на ўсю ячэйку.

— Самі гоняць самагон, а яшчэ агітуюць супроць!

На сходзе ячэйкі комсамольцы жыва адгукнуліся на заклік сакратара падняць



аўтарытэт ячэйкі. Цэлы шэраг добрых прапаноў упрыгожылі лісты пратаколаў. «Наладзіць грамадзкі суд над комсамольцам Старадаўтавым»—быў пункт. Але «вумнікі» з актывістых, захавалі ініцыятыву комсамольцаў і ня гледзячы на пастанову агульнага сходу, так і не кранулі хуліганаў.

У завадзкіх цэхах, ля варштатаў, у політшколе, у клюбе, у хаце-чытальні прабіваецца творчая комсамольская думка. Соцыялістычная вытворчасьць, культура, новы быт—усё гэта прываблівае ўвагу нашага маладняка. Бюрократычная пісаніна, кіпы пратаколаў і цыркуляраў, мора ўзгадненьняў і ўвязак—коўш халоднай вады на палкія самадзейныя пачынаньні.

У кампанію перавыбараў бюро ячэек акажам жывое падтрыманьне ініцыятыве зьнізу. Выбярэм у бюро лепшых комсамольцаў.

Усё толькі на паперы.

У часе перавыбараў бюро ячэек ня дрэнна пагаварыць і аб «папяровых балотах». Шмат ячэек патанулі ў іх, а разам з гэтым і патанула жывая праца.

Перад вачыма пляны работы Бабруйскай ячэйкі Лесазаводу № 7, на ліпень—жнівень месяцы 1927 году. Шмат пунктаў, але колькі з іх ня выкананых! Вось вытрымка:

«**Масавая культработа.**

1) Вывучыць імкненьне і цікавячыя моманты ў масавай рабоце, а разам з гэты распрацаваць проэкт пастаноўкі масавай работы на лета. Тав. Навадворац. К 5—VI.—**Ня выканана.** 2) Організаваць групу быту. Тав. Чапковіч. 5—VI—27 г.—**Ня выканана.** 3) Правесьці прагулку разам з ячэйкай Працасьветы. Тав. Закржэўскі, К 1-VII—27 г.—**Ня выканана.** 4) Правесьці прагулку ўверх па рацэ. Панкрацьцеў, Ліпінскі, Слуцкі. К 20—VI—27 г. **Ня выканана.** 5) Правесьці экскурсію ў лягеры. Ханін. К 15—VII—27 г. **Ня выканана.** 6) Вывучыць становішча культурна-масавай работы сярод моладзі ў падшэфнай вёсцы і распрацаваць проэкт, у чым павінна выяўляцца наша дапамога. Пінкевіч, Рачкоўскі. К 30—VI—27 г. **Ня выканана**».

І калі чытаць у пляне аб конкурснай рабоце, дык малюнак той-жа самы. Ухвалена правесьці конкурс на лепшага організатара экскурсій і прагулак, на лепшага стралка, на лепшага танцора,—усё гэта **ня выканана**. Возьмем плян вясковай Васілевіцкай ячэйкі.

«Маючы на ўвазе слабы рост у ячэйцы, для чаго шырэй разгарнуць масавую работу сярод моладзі, уцягваючы ў работу сялянскую моладзь, каб такім шляхам мець рост за кошт моладзі»...

Маючы на ўвазе нядысцыплінаванасьць, плян паказвае: „...**Заняцца выжыцьцём іх, шляхам работы ў ячэйцы**“. Дапамагаць у працы эконом-працаўніку, комсамольцам-сельсаветчыкам і г. д. плян прапануе: „...**Даваць практычныя паказаньні ў іх працы шляхам заслухоўваньня справаздачных дакладаў на сходах ячэйкі**“.

Складаць пляны з пунктамі конкрэтнай працы, з пунктамі тэрміну выкананьня, даручэньня; правяраць іх павінна навучыцца кожная ячэйка. Хай кожны комсамолец падумае аб практычных прапановах. Тады ня будзе «папяровых балот».



Тут пахаваны пастановы ячэйкі.

Нашы гора-актывісты.

„... І каб наш актыў з такім апэтытам узяўся за працу, з якім ён возьмецца за гэты торт“.

(З прамовы комсамольца-харчавіка, які прыпаднёс райконфэрэнцыі Менскага гар-раёну торт-зьвязду).

Пры перавыбарах бюро ячэек, падводзячы вынікі працы, напрашваецца пытаньне аб працы самога ячэйковага актыву. Недысцыплінаванасьць, нядбайнасьць, неадказнасьць у працы—займае яшчэ значнае месца сярод нашага актыву. Ёсьць факты, калі ад нежаданьня працаваць, актыў ячэйкі ставіў пытаньне аб роспуску ячэйкі, вышукваючы пры гэтым розныя матывы. (Ячэйка саюзу мэталістых, 4-х працколектываў скурнікаў, друкары і інш.). У ячэйцы саюзу мэталістых сакратар і апорг, абодва 1905 году нараджэньня, прызываліся. І з прычыны прызыву, які адбудзецца ў кастрычніку, яны ў пачатку жніўня спынілі працу.

— Усё роўна, раней ці пазьней, а трэ' будзе кінуць яе!

І калі пытаньне паўстала на бюро РК, яны прапанавалі распусьціць ячэйку.

У ячэйках, як напрыклад, Белдзяржбуд, Гандлёва-Будаўнічага трэсту, працколектыву пекароў, Камгасу і інш.—



У павуценьні бюракратызму.

апоргі ўсё лета нічога не рабілі. Яны праваліді работу па самаадукацыі, нічога не рабілі па культмасавай працы. А калі прыходзілі ў райком, у дзелавой позе узгадвялі пляны, атрымлівалі дырэктывы. А вышаўшы за парог РК усё забывалі.

Мерапрыемствы райкому (пленумы, нарады і г. д.) гэтымі актывістымі, вядома, не наведваюцца. Яны ня ведаюць аб чым там гавораць, а калі райком патрабуе выкананьня работы, яны бягуць у РК, пытаюцца, у чым справа, як і што трэба рабіць.

Частка актыву так разьвіньцілася, што якое-небудзь тэрміновае заданьне сустракаюць з ухмылкай і, вядома, ня выконваюць. Так было пры паходзе ў лягеры, пры правядзеньні суботніка і г. д.

Справаздачы, сводкі пагалоўна можна сказаць усімі ячэйкамі сваечасова не дасылаюцца ў РК. А па гэтых справаздачах мы падводзім вынікі работы і вызначаем далейшыя задачы.

Пры перавыбарах бюро ячэек трэба не захапляцца званьнем актывістых, «добрых араціляў», трэба адбіраць людзей дысцыплінаваных, вытрыманых, трэба перабраць нізы і адтуль чэрпаць адданых рабоце кіраўнікоў ячэйкі. Толькі тады будзе забясьпечана карысная работа нашых ячэек.

Я. Рубенчык.



Працягваем усебеларускі мітынг!

Словы і справы за вёскай.

Прамова прадстаўніка газэты „Чырвоная Зьмена“.

У гарадох амаль ужо няма ніводнай ячэйкі, дзе не распачалася-б самая шырокая падрыхтоўка да суботніка. Больш дрэнна, пакуль што, знаходзяцца справы ў вёсцы. «Раскачка» ідзе слаба, цяжкімі крокамі.

Мы ведаем толькі некалькі раёнаў (Бярэзінскі, Менскай акругі, Плешчаніцкі) дзе пытаньне аб суботніку прапрацована і ажыцьцёўлена як адно з найбольш важных пытаньняў бягучай саюзнай работы.

У адным з папярэдніх нумароў (тры тыдні назад) быў надрукаваны падрабязговы матар'ял аб тых формах грамадзкай работы, якую, пажадана, каб зрабілі комсамольцы,

Прыкладным плянам таго, што павінны зрабіць вясковыя комсамольцы ў выглядзе суботніка можа служыць плян Вільшчынскай ячэйкі.

Допіс аб ёй мы ўжо зьмяшчалі, але лічым карысным кароценька пералічыць іх працу.

— За першы дзень асушыць балота аднаму бедняку.

— У другі дзень—паправяць папсаваныя дарогі і дапамогуць працаваць на гаспадарцы некальцім беднякам і аднаму пагарэльцу.

— Трэці дзень—усе комсамольцы і значная частка беспартыйнай моладзі будуць капаць бульбу. Заробленыя грошы пойдуць на карысьць бяспрытульных.

У гэтым кароценькім пляне Вільшчанскай ячэйкі вельмі ўдала асяродкавана ўся тая праца, якую зараз трэба рабіць вясковым комсамольцам.

На нашым мітынгу пакуль што голас вёсні чуцен ня так моцна, як гэта патрэбна.

Мы чакаем прамоў прадстаўнікоў вёскі, мы чакаем матар'ялаў аб тым, што робіць комсамольская вёска ў справе падрыхтоўкі кастрычнікаўскага падарунку.

Рамонт дарог, школ, хат-чытальнень, дапамога бядняцкім гаспадаркам, сем'ям чырвонаармейцаў, камітэтам узаемадапамогі—вось непачаты край работы.

У кожным асобным выпадку вясковыя ячэйкі павінны прыстасоўваць працу да мясцовых асаблівасьцяў. Гэта значыць, робіць ня толькі «наогул», але рабіць тое, што найбольш карысна і патрэбна зараз для тэй ці іншай вёскі.

Як у горадзе, так і ў вёсцы адной з найбольш важных задач падрыхтоўкі суботніка застаецца ўцягненьне дарослых сялян.

У гэтых адносінах нашым вясковым комсамольцам неабходна скарыстаць вопыт гораду.

Гэты вопыт кажа, што «нахрапам» дарослых ня ўцягнеш. Патрэбна дасканальнае папярэдняе растлумачэньне мэты суботніка, трэба раней падрыхтаваць глебу да прыцягненьня дарослых.

Горад ужо шырока разгарнуў суботнікі.

Зараз словы і самае галоўнае, **справы** за вёскай, за вясковай комсамоліяй.

32 друкары аддалі свой заробак бяспрытульным.

(Прамова сэкратара ячэйкі 1-ай друкарні т. Рубінскага).


Наш заробак за адзін дзень —нядзелю—75 рублёў.

Да ўмоўленага часу прышло 32 ч. Ніводнага хто-б спазьніўся, ніводнага хто-б ня прышоў.

Суботніку, ня было ніводнага хлапца, які-б адмовіўся ад працы.

Гэта была першая наша нядзеля...

У наступную мы організоўваем суботнікі для астатніх сяброў ячэйкі ў сябе ў



Мы работалі на звычайнай друкарскай працы. Але яе выкананьне было бліскучай, чымся ў іншыя дні...

Работала **пяць беспартыйных рабочых.**

Адміністрацыя зрабіла ўсё, каб суботнік прайшоў добра, вылучыла старшых па аддзяленьні, прадаставіла неабходныя работы...

Ячэйка перад суботнікам правяла вялікую работу. Трэ' было добра падрыхтавацца... На сходзе, прысьвечаным суботніку, ня было ніводнага хлапца...

друкарні і на складах Белдзяржвыдавецтва.

Трэба адзначыць намесьніка загадчыка друкарні т. **Кандрашэвіча**, накладчыцу т. **Кугельман**, і т. **Мацкевіча**, якія адны з першых сярод беспартыйных рабочых далі сваю згоду на ўдзел у суботніку.

Я канчаю сваю прамову і спадзяюся, што наступныя суботнікі пройдуць гэтак добра, як прайшоў і першы наш суботнік.

Заклік да ўсіх дарослых працоўных.

Першая Менская акруговая конфэрэнцыя рабочых-друкароў заклікае працоўных Беларусі шчыра падтрымаць пачынаньне моладзі і ўсім прыняць удзел у праводзячыхся суботніках на карысьць бяспрытульных.

Калі зьвінелі пілы і пела цыркулярка.

Першы суботнік у аб'яднанай профтэхшколе.

ПРАМОВА т. ПАЛЯКОВА.

(Вучань-сталяр Менскай аб'яднанай профтэхшколы).

Таварышы! Наш першы суботнік прайшоў надзвычайна організавана. Ён так захапіў хлапцоў, што шмат хто заявіў аб сваёй згодзе працаваць і ў астатнія дні правядзеньня суботніка.

У нашай школе суботнік не ў першыню. Калісьці хлапцы шляхам суботніка рабілі інструмант і ўстаўлялі шыбы.

Спазьніўшымся на суботнік было дрэнна, ім не давалі супакою, як гэта яны праспалі суботнік.

Цікава форма правядзеньня суботніка ў нашай школе. Ён працягнецца месяц аж да сьвята Кастрычніковай рэволюцыі. Парадак яго наступны: кожны комсамолец павінен адпрацаваць, мінімум 8 гадзін, у адну з нядзель. А ёсьць комсамольцы і беспартыйныя, якія заявілі аб сваім жаданьні працаваць і болей.



Субботнік у аб'яднанай профтэхшколе. У авале майстар т. Шунэйка.

І вось у мінулую нядзелю у **8** гадзін мы пачалі працаваць. Прышло—**22** чалавекі. Работала **2** адзяленьні: **машыннае сталярнае.**

На версе машыннага адзяленьня грукат цыркуляркі мяшаўся з гоманам хлапцоў, жартамі і песьнямі... У машынным рыхтавалі матар'ял, расьпілівалі дошкі, і адводзілі «рыскі».

У сталярцы складалі і склейвалі белыя сасновыя лавы.. У сталярцы зьвінелі пілы, а навокал стаяў дым ад падгарэўшага клею.

Гэтак пачаўся першы дзень нашага суботніка. Прышло **5** беспартыйных. Першым згадзіўся працаваць і прыйшоў на работу т. **Яцкоўскі**, вучань, беспартыйны.

У наступную нядзелю пачнуць працаваць хлапцы з мэталь-цэху. Будзе пушчала ліцейная, будуць пушчаны і такарныя станкі.

Я, таварышы, да сваёй прамовы дадаю яшчэ вось што: у нас у цэху першы аддаў свой заробак бяспрытульным і кіраваў работамі ў двух цэхах майстар т. **Шунэйка.**

Выручка за ўвесь суботнік па папярэдніх падліках будзе 120-130 р., за першы-ж дзень яна раўнялася—30 р.

Адміністрацыя школы прыхільна адносіцца да суботніка, дапамаглі нам чым можна, дастала добрыя заказы, далі добры інструмант.

Зарабілі 130 рублёў.

Прамова т. Чыжова.

(Служачы скуранога сындыкату).

Так ніколі ў нас не працавала кантора. Роўна а дзевятай гадзіне, служачыя былі на сваіх мясцох. Штосьці інакшае адчувалася ў іх рабоце. Як і заўсёды стукалі мэханічныя шчотчыкі, але работа ішла жывей і не паходзіла на шэрую, будзённую...

40 чалавек—поўны склад канторы — былі на суботніку.

Напружана і ўпарта работала кантора. 6 гадзін пранеслося няпрыкметна...

І як было прыемна нам 8 комсамольцам, пачуць словы загадчыка, які абвесьціў, што першы заробак раўняецца 130 р. 27 к.

Пару слоў аб падрыхтоўцы.

Быў скліканы сход. Звычайны сход. І ўсім здавалася што пытаньне «аб бяспрытульных», будзе ня цікавым. Але слова «суботнік» узварушыла сход. І бліскучым доказам узьнятай зацікаўленасьці, была яўка ўсіх на работу. Яўка была стопроцантная.

Апрача таго, што наша ячэйка організавала суботнік сярод служачых, мы прыбавілі да гэтай справы і піонэраў.

Якім чынам?

Бязумоўна, што ня шляхам дачы работ у канторы.

Не.

Мы даручылі ім падрыхтаваць суботнік, падрыхтаваць так, каб у суботнік прышлі працаваць усе.

І гэта было зроблена.

За некалькі дзён да суботніка у канторы віселі вялікія лёзунгі:

> **„Няма ніводнага працоўнага, які-б адмовіўся дапамагчы бяспрытульным“.**

Гэта быў ачшлаг суботніка, ну а аб самым суботніку, вы ўжо ведаеце.

Рамантуем клюб і хату-чытальню.

Прамова т. Рашчынскага.

(Селянін вёскі Навасёлкі, Пухавіцкага с.-с. Менскай акругі).

Таварышы! У час, калі вы слухаеце маю прамову--наша моладзь працуе.

Наша ячэйка рашыла справу суботніка не адкладаць, а зараз-жа ўзяцца за яе.

Што мы робім?

Мы пачалі рамантаваць наш **клюб** і **хату-чытальню.** Гэта работа разьлічана на некалькі дзён, і мы ня кінем яе пакуль ня скончым.

Працуе--29 чалавек.

Пачынаем раніцою і канчаем калі надыходзіць цемра. Клюб дагэтуль быў зусім разбураны, ня было шыбаў, дзьверы былі разламаны, лавы такія, што сесьці ня можна.

Зараз ужо блішчыць новымі дошкамі сцэна, зрабілі будку, некалькі хлапцоў намалявалі дэкорацыі, а дзяўчаты сшылі заслону.

Будзе часткова яшчэ зьменена падлога і зроблены новыя лавы.

Усе гэта робіцца на свае сродкі, хто цьвік, хто дошку прыцягне, а хто і бервяно.

У хаце-чытальні мы, калі хопіць сродкаў, адрамантуем сталы і шафы, намалюем новыя плякаты і адным словам аддзелаем хату на «яць».

Калі работа будзе скончана, пабелім клюб і калі хопіць крэйды, дык і хатучытальню.

Пасьля ўсяго зробім урачыстае адчыненьне. Навочна прадэманструем сялянам, што можна зрабіць колектыўнай справай.

Калі працуем, нас абкружаюць сяляне, даюць парады і дапамагаюць у рабоце.

Вось, як праходзіць «суботнік» у вёсцы Навасёлкі.

Рамантуем памяшканьні.

Прамова таварыша Саўліта.

(Плешчаніцкі раён, Меншчына)

Наша організацыя па колькасьці невялічкая і асобныя ячэйкі налічваюць невялікі лік сяброў.

Але, каб падтрымаць добры пачатак мы маем на ўвазе зрабіць наступнае:

У мястэчку Плешчаніцы ёсьць нардом, будынак гэты новы, стаіць на пляцу, адкрыты з усіх бакоў. Вакол—гразь. Мы ачысьцім пляц, абгародзім яго з тым каб увесну магчыма было пасадзіць дрэвы.

Акалоўская ячэйка дапаможа абсталяваць хату-чытальню.

Камароўская і Пасадзецкая ячэйкі адрамантуюць і прыстасуюць да зімовай клюбнай работы некалькі памяшканьняў.

Як мы працавали ўтрох.

Слова т. Салавейчыка.

(Загадчык расійскім аддзелам польскага магазыну «Культура»).

Таварышы! Мы выпадкова натрапілі на нумар «Чырвонай Зьмены», прысьвечаны комсамольскаму суботніку і асабліва мы зьдзіўлены былі артыкулам аб суботніку ў магазыне Дзяржвыдавецтва.

Нашы служачыя падтрымалі мяне. Мы па прыкладу магазыну Дзяржвыдавецтва організавалі ў сябе ў магазыне суботнік.

Працавала нас—**трое** Усе беспартыйныя.

Выручка—**15** руб.

За дзень да суботніка мы намалявалі вялікі яскравы плякат і вывесілі яго на шыльдзе:

> **Магазын працуе з прычыны комсамольскага суботніка.**

Плякат зрабіў сваё. Суботнік прайшоў добра.

У краме малочнага таварыства.

(Прамова сакратара ячэйкі Наркамгандлю).

Ячэйка Наркамгандлю праводзіць кампанію за суботнікі на ўсіх прадпрыемствах, якія яна аб'яднае.

У краме малочнага таварыства, па Комсамольскай вуліцы, суботнік прайшоў надзвычайна добра.

Працавала 8 беспартыйных і адзін комсамолец. Заробак прыблізна дасягае 30 руб. Трэба адзначыць, што беспартыйныя служачыя вельмі ахвотна ўдзельнічалі, самі намалявалі і вывесілі плякаты на шыльдах.

Працаваць зьявіліся ўсе. Ніводзін не застаўся ў хаце ці „захварэў“.

16 рублёў.

Прамова Мікуліча.

(Спэц-кляса пры 9 сямігодцы).

Праз паўгадзіны хадзьбы з-за невялічкага ўзгорку паказаўся саўхоз імя Розы Люксэмбург—наша месца правядзеньня суботніка.

Адпачыўшы крыху, мы адразу прыняліся за працу - пачалі капаць бульбу.

Было неяк весела з-за таго, што дзень выдаўся ня надта шэры, што хацелася прынесьці сваёй працай якую небудзь карысьць.

Роўнай і доўгай стужкай цягнуўся шэраг хлопцаў дружна схіліўшыхся да зямлі.

Кожны стараўся, каб яго мяшок хутчэй запаўняўся.

У першы дзень суботніка, у нядзелю 9 кастрычніка, хлопцы зарабілі 16 рублёў.





СПРАВЫ І ДНІ АДНАГО ПРАДПРЫЕМСТВА

АГЛЯД АБУТКАВАЙ ФАБРЫКІ



АГЛЯД УЗВАРУХНУУ УСЮ ФАБРЫКУ. АЛЕ СЛАБА АСЬВЯТЛЯЕЦЦА РАБОТА КОМСАМОЛЬСКАЙ ЯЧЭЙКІ Ў СПРАВЕ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ ВЫТВОРЧАСЬЦІ І ЛЕПШАЙ ПАСТАНОЎКІ ВУЧНЁЎСТВА. НЕ АСЬВЯТЛЯЮЦЦА АДНОСІНЫ РАБОЧЫХ І МОЛАДЗІ ДА НАДЫХОДЗЯЧАЙ КОНВЭЙЕРЫЗАЦЫІ ФАБРЫКІ.

НЕКАТОРЫЯ РАБОЧЫЯ СУМНЯВАЮЦЦА Ў ТЫМ, ШТО ІХ ПРАПАНОВЫ БУДУЦЬ ПРАВЕДЗЕНЫ Ў ЖЫЦЬЦЁ.

Задача комсамольцаў—зьнішчыць пералічаныя недахопы і забясьпечыць асьвятленьне ў газэце пытаньняў: быту моладзі, грамадзкай работы ячэйкі і якасьці продукцыі фабрыкі.

У аддзелачным аддзяленьні.

Ня мае вядомай работы.

— Напішы і мне што-небудзь аб аглядзе,—зьвярнуўся да мяне рабочы аддзелачнага аддзяленьня т. І. Ш. Просьбу яго я здаволіў.

— На фабрыцы нядаўна пачаў работаць падростак САНЧУК. Паставілі яго к нумаровачнай машыне. Работаў добра.

Але ўся бяда ў тым, што яго часта адрываюць на іншыя работы: рэзаць паперу на ранты і г. д.

Гэтага не павінна быць. Санчука трэба паставіць на вядомую работу, тады ён будзе правільна абучацца.

Фабкому і экономкамісіі на гэта трэба зьвярнуць увагу. **А. Г.**

Цьвікі, „лялькі" і ваганеткі.

Ня вучаць працаваць на машыне.

Таварыш Герайціс паступіў на фабрыку вучыцца ў якасьці фрэйзароўшчыка.

Папрацаваў ён на фрэйзароўскай машыне ня больш як... некалькі дзён.

Зараз-жа Герайціс больш усяго заняты на фабрыцы шліфоўкай набоек, насыпаньнем цьвікоў, прыбіўкай «лялек» (маленькія боцікі) і расстаўленьнем ваганетак.

Працаваць-жа на машыне яго ня вучаць. Пытаньне гэта стала ўжо на пасяджэньні фабкому, але ніякіх вынікаў няма, і дагэтуль комсамольская ячэйка не зьвяртае на гэты факт ніякай увагі.

Герайціс працуе на фабрыцы ўжо каля 2 год, а атрымоўвае зарплату ўсё яшчэ па 4 разрадзе. Хлапцу ўжо стукнула 19 год, а ён усё яшчэ лічыцца «бранявіком».

Розэнфэльд.

У штамповачным аддзяленьні.

Шляпачнік пакрыўджаны.

Падыхожу да вучня штамповачнага аддзяленьня — **Шляпачніка**. Выконвае ён лёгкую падсобную работу: загібае ў круг паждачную бумагу.

— Вось,—кажа ён з агідай,—якая ў мяне работа. Работаю і на прэсе, але на ім кожны можа работаць.

— Хутка будзе пачынена кранцавая машына, на якой ты працаваў,—пробую я яго супакоіць.

— Гэта таксама мала кваліфікаваная работа,—адказвае ён.

Хоць і маленькі вучань Шляпачнік, але вадта пакрыўджаны тым, што час абучэньня праходзіць, а кваліфікацыі ён не атрымоўвае.

Свой.

І мая галава баліць.

Кранцавую машыну вучня Шляпачніка рамантуюць. Пакуль што ён работае з прэсам і выконвае розныя падсобныя работы.

Хлапец ён—здольны. Але становішча такое, што няма машын. **«Мне самому ў галаве за яго круціць».**

Я—сябар вучнёўскай камісіі і думаю: як-бы гэта зрабіць, каб правільна скарыстоўваць вучняў. Бяда, што няма куды іх ставіць.

Калі ў дзень пачнуць выраблять 400 пар абутку (праз $1^1/_2$ месяца), тады кожны рабочы, маючы поўную нагрузку, будзе работаць выключна на адной машыне, замест работы на двух, як гэта робіцца зараз. Тады зьявіцца магчымасьць паставіць вучняў работать ля машын.

Майстар штамповачнага аддзяленьня **Асіповіч.**

Прагульшчык.



Адгадайце яго прозьвішча.

У нацяжным аддзяленьні.

Праз 3 месяцы „разбраніруюць".

Вучуся на фабрыцы ўжо 3-ці год. Амаль год быў на падсобнай рабоце ў аддзелачным аддзяленьні.

Другі год вучуся на машыне ў нацяжным аддзяленьні.

Магу работаць на 3-х машынах: вінтавой, кутай і шытай. На іх з майстрам работаем па чарзе.

Праз 3 месяцы мяне «разбраніруюць».

Вучань **Бабро ўскі.**

Кожны беражэ свой інструмант

Псаваньні бываюць нязначныя

У нацяжным аддзяленьні толькі хлапец Г. работае на машыне.

Ён выконвае работу добраякасна. Да машыны адносіцца з увагай, калі трэба вымазвае яе, аглядае.

Хлапец атрымаў поўную кваліфікацыю і хутка будзе разбраніраван.

Уся астатняя моладзь работае на падсобнай рабоце. Мае толькі нож, клешчы. Кожны беражэ свой інструмант.

Работае ў нас большая колькасьць комсамольцаў. Работу выконваюць добраякасна.

Калі бываюць дэфэкты ў рабоце, то майстар Шымански на іх указвае. Псаваньні бываюць нязначныя. **С. К.**

Папраўка.

У допісе майстра загатоўчага аддзяленьня тав. Кроля «Неабходзен адзін фасон абутку« (Чырвоная Зьмена» № 109) абмылкова напісана «...маецца некаторая незацікаўленасьць рабочых у кройцы тавараў» Трэба чытаць: «Прыкмячаецца незацікаўленасьць рабочых у захаваньні матар'ялаў (валяюцца катушкі, кускі палатна).

Хапаецца за машыну.

Вучню Галенсону мала прыходзіцца работаць на машыне. У мяне поўная нагрузка, з-за гэтага амаль увесь час я машыну і займаю.

Калі-ж работу прыходзіцца выконваць рукамі, Галенсон **хапаецца** за машыну. Але гэта бывае рэдка.

Часам машына і свабодна, а яму няма чаго даць работаць. Гэта бывае тады, калі адсутнічаюць нізкія абсацы. А высокія абсацы вельмі цяжка прыбіваць, не пад сілу.

Пакуль што ён больш працуе на падсобнай рабоце. Работай цікавіцца. Узаемаадносіны ў нас добрыя.

Рабочы **Цырлін.**

Гоняцца за заробкам.

Тав. Вынік атрымаў 3 вымовы

Ня досыць добрая якасьць працы залежыць часткова ад няпрыгоднасьці інвэнтару, няспраўнасьці машын, а часткова і ад незацікаўленасьці некаторых рабочых.

З боку моладзі наглядаецца таксама дрэнная якасьць працы.

Гэта часткова тлумачыцца жаданьнем павялічыць заробак. Хуткасьць адбіваецца на якасьці.

Як прыклад, магу назваць комсамольца Выніка, які ўжо атрымаў ад адміністрацыі 3 вымовы.

Рабочы **Гершачэр.**

Пажаданьні неабходна выканаць.

Што сказала нарада майстроў і вучняў.

У мінулым нумары нашай газэты была зьмешчана прапанова **рабочага Баскіна** аб мэтазгоднасьці скліканьня нарады вучняў з майстрамі.

6-га кастрычніка гэтая нарада рэдакцыяй «Чырвонай Зьмены» была праведзена.

На нарадзе, акром вучняў і майстроў, прысутнічалі: вучнёўская камісія, інструктары, прадстаўнікі адміністрацыі, фабкому, рабкоры і г. д.,—усяго 31 чал.

Мэта нарады—практычна дапамагчы вучням фабрыкі ў справе абучэньня. І для гэтага на нарадзе не гаварылі аб агульным становішчы абучэньня, а адразу-ж, пасьля кароценькай уступнай прамовы прадстаўніка рэдакцыі, падышлі да пытаньня так, каб ад яе была карысьць. Абучэньне кожнага вучня фабрыкі разьбіралі асобна, і ў адносінах кожнага выносілі належныя пастановы.

Напрыклад, вучань загатоўчага аддзяленьня—**Сагаловіч** працуе на фабрыцы ўжо 3 гады. Пасьпявае лепей астатніх вучняў загатоўчага аддзяленьня. Адносіны з майстрам — Бацьвіньнікам—таварыскія. Ён на нарадзе заявіў аб тым, што за час свайго абучэньня вывучыў толькі адну работу. Работа, праўда, кваліфікаваная, але зараз утварылася такое становішча, што для выконваньня яе прывозіцца машына, а Сагаловіч, які другой работы ня ведае, прымушан будзе пачаць вучыцца спачатку на чым небудзь іншым. Нарада доўга абмяркоўвала заяву Сагаловіча. І ў выніку пастанавіла:

— Абучыць яго ўсёй сталавой рабоце. Сталавікоў і машыністаў загатоўчага аддзяленьня ў далейшым абучаць так, каб яны праходзілі ўсе процэсы работы па галіне сваёй спэцыяльнасьці. Дапускаць, па жаданьню, сталавікоў да абучэньня на швэйнай машыне і наадварот.

Тое самае з вучаніцай—**Юдалевіч**. Работай яна цікавіцца. Здольна. Працавала на адной з машын, якая зараз зламалася і яна ўжо 3 тыдні знаходзіцца на падсобнай рабоце: шнуруе чаравікі.

У адносінах да яе нарада ўхваліла:

— Перавесьці на закалодку, а калі ўцяміць яе, знаёміць з іншымі відамі работамі.

Вучаніца **Зальцман** заявіла аб тым, што ўсё добра, але толькі прыходзіцца працаваць над тымі работамі, якія ўжо добра ёй вядомы. Яна-ж жадае прасунуцца ўперад.

Нарада ўхваліла: Пажадана прасоўваць т. Зальцман па ўсім процэсам работы швэйных машын, якіх яна яшчэ ня ведае.

Справа аб вучні **Бабро ўскім** не разглядалася толькі таму, што абучэньне яго пастаўлена добра. Ён ужо работае на 3-х машынах і скора будзе «разбраніраваны».

Вучань **Санчук** паступіў на фабрыку нядаўна. Пасьпявае. Бяда ў тым, што яго часта адрываюць на іншыя работы. На нарадзе выявілася, што справа з яго работай на фабрыцы наогул неяк заблытана і таму ўхваліла:

Высьвятліць у адміністрацыі, на якіх асновах Санчук быў прыняты на фабрыку і якое месца ў ёй ён займае ў сучасны момант.

Герайціс—паступіў вучыцца фрэйзероўшчыкам. На фабрыцы ўжо 2 гады. Мае 19 год, а яшчэ—«бранявік». Аснаўная работа у яго—шліфтоўка набаек. Выконвае ён і падсобную работу: насыпае цьвікі, прыбівае лялькі. На фрэйзеровачнай машыне яго ня вучаць.



Майстар Асіповіч.

Нарада выказалася **за неабходнасьць абучэньня Герайціса на фрэйзеровачнай машыне.**

Кепска абстаіць справа з вучнем **Галенсонам.** Працуе паўтара гады, і ўсё выкарыстоўваецца на падсобных работах. Яго майстар Цырлін заявіў, што гэта тлумачыцца адсутнасьцю машыны, на якой можна было-б яго навучыць, падругое —ён не атрымлівае компэнсацыі за гэта. Наогул-жа выявілася, што Цырлін да абучэньня вучня адносіцца ня зусім добра.

У адносінах яго вынесьлі пастанову:— Цырліну зьвярнуць увагу на абучэньне Галенсона, дапускаючы да работы ля машыны да 1-2 гадзіны штодзённа, а таксама паклапаціцца аб тым, каб майстар за гэта атрымліваў належную компэнсацыю.

Абучэньне **Раскіна** (слесарнае аддзяленьне) пастаўлена **добра**, вучань ні на што ня скардзіўся і справа аб ім не разглядалася.

Вучань **Шляпачнік** з-за адсутнасьці машыны ўвесь час знаходзіцца на падсобных работах.

У адносінах да яго нарада сказала:

— Азнаёміць з раскройкай цьвёрдага тавару, а самому—прыглядацца да работы ўсіх машын, у чым майстар павінен яму дапамагаць.

Вось адказы нарады вучняў і майстраў на тыя скаргі, думкі і прапановы рабочых і саміх вучняў фабрыкі, якія да гэтага часу друкаваліся ў нашай газэце.

Задача фабкому глядзець за тым, каб гэтыя пажаданьні былі выкананы ў самым хуткім часе.

За іх выкананьнем будзе сачыць і рэдакцыя.

Сёньня шосты дзень агляду

Адказы на прапановы.

Тав. КРОЛЮ:

Стандартызацыя—справа добрая, але правесьці яе ў нас немагчыма таму, што, папершае—мы не атрымоўваем стандартных заказаў, а па-другое—фабрыка наша невялікая, калодак мала, гэта патрабуе грошай на набыцьцё новых калодак.

Калі пабудуюць адну вялікую абутковую фабрыку, што прадугледжана па 5-гадоваму плану, тады мусіць будзе пастаўлена пытаньне аб стандартызацыі.

Тав. РУСАНОВІЧ:

У нас ёсьць жаночы абутак з нізкімі абсацамі. Ганяцца-ж за рознымі фасонамі і мяняць часта калодкі—мы ня можам. Гэта будзе надта моцна біць па нашай кішэні. І, урэшце, пастаноўка пытаньня аб стандартызацыі зьнімае пытаньне тав. Русановіч.

Дырэктар **Шэрман**

Адказы Кугеля.

(Старшыня вытворчай нарады).

Тав. КЛІОНСКАМУ:

Ня ведаю, як гэта яму і ў галаву прышло, што, быццам, умовы фабрыкі не даваляюць прасоўваць моладзь на больш кваліфікаваную работу. Гэта ня верна.

Ня верна, так сама, і тое, што ля новапрыбываючых машын нельга ставіць моладзь. Калі прыбывае новая машына, то задача майстра—вучыць на ёй „бронь". Да гэтага трэба дадаць, што малады хлапец лепей паддаецца абучэньню.

ДЫРЭКТАР ФАБРЫКІ дадаў: Ёсьць і такія машыны, як, напрыклад, у штамповачным аддзяленьні, ля якіх трэба ставіць толькі добра вопытных рабочых.

Тав. КРОЛЮ:

Дрэннага хрому ў нас наогул няма. Бывае толькі, што адзін кусок тоўсты, а другі тонкі. Адміністрацыя дазваляе выбіраць самы лепшы.

АД РЭДАКЦЫІ: Адказы т. Кугеля зацьверджаны дырэктарам фабрыкі.

Адказам не здаволена.

Тав. Шэрман піша, што ня кольцы вінаваты ў перабоях работы на нашай машыне, а быццам бы тое, што я яшчэ не магу добра на ёй работаць.

Я лічу, што ня рукі тут вінаваты. На гэтай машыне я ўжо навучылася работаць, а вялікія кольцы мяшаюць.

Работніца **Шуслан.**

АД РЭДАКЦЫІ: Пытаньне гэта перадаецца на вытворчую нараду.

Просьба Сагаловіча.

З постановаю нарады майстраў і вучняў я згодзен, але рэдакцыі „Чырвонай Зьмены" трэба паклапаціцца, каб мне дазвалялі браць работу на свой стол.

Вучань Сагаловіч.

Калечым рукі.

(У загатоўчым аддзяленьні).

Некаторыя скрынкі ў загатоўчым аддзяленьні вельмі цяжкія і не абцёсаны. Рабочыя калечаць рукі: то занозу ўсадзяць, то аб цьвік пацарапаюць.

Трэба, папершае—каб скрынкі былі цёсаныя, а падругое—неабходна да іх зрабіць калёсы. Рабочы **Гарміза.**

Дайце драбіну.

Рабочыя штамповачнага аддзяленьня скардзяцца на тое, што калі патрэбна драбіна (лесьніца) то трэба шукаць яе па ўсіх паверхах.

На ўсе 3 паверхі маецца толькі адна драбіна.

Адміністрацыі трэба аб гэтым падумаць. **Свой.**

Сёньня--слова Полацкай піонэрыі.

Камарўскі атрад (Менск) далі узор найлепшай працы.

„Электрыфікацыя" і рамонт клюбу, сталярная майстэрня за... 5 рублёў.

Дзіцячы гарадок.

(Полацак, Дзіцячы Гарадок імя Леніна, Ветрынскага раёну).

Выхаванцы гэтага дзіцячага гарадка—дзеці самых розных нацыянальнасьцяў: тут знойдзеце украінцаў, велікарусаў, палякаў, татар, латышоў, беларусаў, яўрэяў. Усё яны прышлі сюды ў часе голаду, грамадзянскай вайны. На кожным з іх умовы жыцьця пакінулі свой адбітак. Ёсьць тут і панурыя і пужлівыя, але большасьць звыклася з жыцьцём колектыву і пакахала яго. Галоўная задача атрадаў (іх у нас 2) была: паладзіць працу так, каб здаволіць запатрабаваньні кожнага піонэра і выхаванца.

Досуг дзяцей мы праводзілі, галоўным чынам, у гульнях, якія часта складаліся самімі выхаванцамі.

Вясною мы праводзілі суботнікі: ачышчалі спортпляцоўку, будавалі кветнік, угнойвалі глебу і садзілі насеньне. Пад кіраўніцтвам садоўніка рукі піонэраў разьбівалі кветнік на пляны, рабілі розныя фігуры.

Было распрацована заданьне па вывучэньні становішча дзетгарадку. Кожнае зьвяно рабіла сваё: адно абсьледвала майстэрні, другое акеніцы, трэцяе — кухню. Потым рабіліся справаздачы, выпрацоўваліся мерапрыемствы па зьнішчэньню маючыхся недахопаў. У насьценгазэце высьвятлялі дрэнныя бакі ізолятару. У выніку—адміністрацыя палепшыла справы у ізолятары.

Праз насьценгазэту і гутаркі жыва і зразумела растлумачвалася пытаньне аб нацполітыцы. Дзякуючы сталай працы піонэратраду, у гэтым напрамку часткова выжыты варожыя настроі паміж латышоў, яўрэяў і іншых. Працу атрадаў мы праводзім на беларускай мове. У кампанію дапамогі дзецям Кітаю мы сабралі сярод служачых 7 рублёў.

Ваенізацыя ў атрадах заняла значнае месца. На зборах атрадаў былі праведзены гутаркі аб хэмічнай вайне, ваенізацыі і інш. Праводзіліся заняткі з проціvагазам. Цяпер піонэры ведаюць, як з ім абыходзіцца, каб ратаваць сябе ад атрутных газаў. Па зьвеньнях вывучалася азбука «Морзэ» і сыгналізацыя. Была праведзена экскурсія ў пагранічны атрад, дзе піонэры азнаёміліся з бытам чырвонаармейцаў. У гуртку вайсковых ведаў мы вывучаем вінтоўку.

Пры атрадзе організаваны гурток па вывучэньні статуту і праграмы комсамолу. Ёсьць свой шумавы оркэстр, які цяпер рыхтуецца да Кастрычнікавай рэволюцыі.

На піонэр-сэмінарыі пры атрадах былі прапрацаваны два практычныя пытаньні: 1) організацыя досугу і 2) вучот працы. Конкрэтныя мерапрыемствы падрыхтоўваліся самімі піонэрамі і ўносіліся на абгаварэньне сэмінарый. Больш за ўсе цікавяцца піонэры гутаркамі аб міжнародных падзеях, якія праводзяцца заўсёды з географічнай картай. Праводзіліся гутаркі і па тэхнічных пытаньнях: гутарку, як працуе кіно, мы правялі перад кіно-сэансам. Цяпер піонэры будуюць першую лятаючую модэль самалёту. Покуль што гэтым займаюцца адзінкі, хутка мы організуем модэльны гурток.

Г—д.

Добра акцябратам у нас.

(Полацак, атрад імя Красіна).

Ня было ў нас кіраўніка кравецкім гуртком. Што рабіць? Паставілі гэтае пытаньне на бацькаўскім вечары. Адна з матак згадзілася кіраваць. На занятках гуртка мы навучыліся шыць спадніцы, латаць паліты, хусткі. Многія навучыліся вышываць, нават шыць сукенкі. Піонэры пашылі 25 значкоў, («зорак») для акцябрат.

Добрую працу мы правялі на дзіцячай пляцоўцы ЦРК. Зьбіраліся мы туды а 9 гадзіне раніцою, гулялі, вялі карагоды, пелі растлумачвалі акцябратам малюнкі. З 11 гадзін—дапамагалі кіраўнікам рабіць дзецям халодныя расьціраньні, сачылі за парадкам у часе мыцьця рук, чысткі зубоў, падавалі акцябратам есьці, выстраівалі іх для прагулкі, ішлі з імі ў дыспансэр. Там мы дапамагалі ўрачу іх аглядаць, разьдзяваць, пісаць анкету.

Група піонэраў.

Па сыгналу---у ваду, па сыгналу---з вады.

(Полацк).

Хутка давёз нас цягнік на станцыю Беркавічы. Вось і палаткі ўбачылі. Выстраіліся яны ў садзе, блішчаць белымі бакамі і чакаюць піонэраў. Прыехала нас спачатку 51 чалавек, потым яшчэ 35 і яшчэ 31.—Усяго ў лягеры пабывала 117 чалавек. Ня гледзячы на кароткі тэрмін прабываньня ў лягеры (21 дзень)—добра адрамантавалі здароўе.

Зважыліся 20 піонэраў. Аказалася, за 9 «лягерных дзён» набылі шмат фунтаў. Вось лічбы: на 7 фунтаў і больш прыбыла 2 чалавекі. На 5 фунтаў—5 чалавек, на 4—2 чалявекі, на 3—5 чал. і на 2—3 чалавекі. Палягчэўшых у вазе —няма.

Лягер у Полацку мы праводзілі ўпяршыню і дзякуючы раньняй падрыхтоўцы (з красавіка) правялі яго добра.

У 8 гадзін раніцою гучны горн будзіў нас ад салодкага сну.

Строімся на купаньне. І як прыемна, пасьля 25 хвіліннай гімнастыкі, пад стук барабану шагаць да ракі.

Па сыгналу—у ваду, па сыгналу—з вады. Сьнеданьне добрае: яечка, хлеб з маслам, гарбата.

Пачынаецца працоўны дзень. Піонэры носяць трэскі, ваду, рэжуць хлеб. Дапамагаюць і сялянам. Цэлы горад калосьсяў выпалалі піонэры для сялян, дапамаглі ладзіць дарогі.

Пасьля працы—вольны час. Піонэры чытаюць (была бібліотэка), гуляюць у шашкі, вудзяць рыбу, пішуць лісты да хаты аб лягерным жыцьці.

А палове 12-й — сонечныя ванны. (Хлапцы хадзілі ўвесь час без кашуль). Пасьля абеду, «мёртвай гадзіны»—прыбіраньне палатак, лінейкі, потым зноў яда —булка з малаком.

Вечарамі праводзілі гульні, гутаркі ля кастра.

І. Волкінд.



(Саўхоз «Чырвоная Зорка», Глускага раёну, Бабруйшчына).

Атрымалі мы паперку з райбюро ЮП аб тым, як весьці барацьбу са шкоднікамі садоў і агародаў, як ахоўваць карысных птушак. У саўхозе нашым шмат садоў і агародаў, і шмат у іх розных шкоднікаў расьлін. Вось і парашылі піонэры павесьці з імі рашучую барацьбу, добра што паказаньні ёсьць.

Старэйшаму зьвяну далі заданьне—азнаёміцца з карыснымі птушкамі, якія зьнішчаюць шкоднікаў агародаў. На зборы зьвяна, шляхам чытаньня, абменам «асабістага вопыту», устанавілі, што: «Птушка цігор, жоўтабрушка, валасянка, ластаўка—надта любяць машкару і чарвякоў. Трэба іх ахоўваць на сваім гародзе, вучыць гэтаму іншых дзяцей.

Сярэдняму зьвяну было дадзена заданьне: Правесьці гутарку сярод неорганізаваных дзяцей аб карысных птушках.

Многа птушыных гнёздаў зьнішчыла дзетвара ў нашай вёсцы. Былі нават «спэцы» гэтай працы—браты Галандзкія. Яны будавалі сіло свайго вынаходжаньня, ставілі яго ў кожным кусьціку, на кожным бліжэйшым дрэве.

Перад тым, як правесьці гутарку, кожны піонэр «агітаваў» сваіх маленькіх суседзяў.

— Чуеш, у газоне заўтра будзем аб птушках гаварыць. Прыходзь!

Братоў Галандзкіх так і не ўдалося прыцягнуць на гутарку.

— Навошта яна нам! — усьміхаліся хуліганы.

Гутарка аб птушках прайшла даволі жыва. Павадыр апавядаў аб шкодных чарвяках на градках агародаў і як трэба ахоўваць карысных птушак, якія зьнішчаюць «садовых ворагаў». У выніку праведзенай кампаніі маюцца вялікія дасягненьні: дзеці, блізка каля вёскі, ужо не чапаюць птушак, не разбураюць іх гнёзды. Цяпер ужо ў садох і агародах рэдка калі знойдзеш якога-небудзь чарвяка.

Цяжка было весьці барацьбу з братамі Галандзкімі. Надта яны былі хуліганістымі. Упяршыню яны сумысьля разбуралі гнёзды, нават разбуралі піонэрскія градкі. Але потым і яны сьціхлі.

Кузьма Гарбулька.



Ворагі птушак.

Расьпяваем песьні аб Кітаі.
Добра азнаёміліся з процівагазам.

(Полацак, атрад імя КІМ'у).

Першае заданьне, «Падвядзеньне вынікаў зімовай працы»—мы выканалі добра. Выпусьцілі нумар насьценгазэты, з допісамі і дыяграмамі па гэтым пытаньні, выявілі адсталых у вучобе піонэраў прымацавалі да іх больш падрыхтаваных таварышоў.

Другое заданьне, «Дапаможам кітайскім дзецям» мы пачалі з платнага вечара. Быў даклад з жывымі дыяграмамі аб росьце кітайскай компартыі, комсамолу, піонэраў, аб росьце сялянскага руху. П'еску аб жыцьці кітайскіх дзяцей склалі самі піонэры. Выручылі 13 руб. 60 кап. Зрабілі «кітайскі куток», дзе зьмясьцілі карту Кітаю, альбом з газэтных выразак аб жыцьці кітайскай дзетвары, выпусьцілі спэцыяльны нумар насьценгазэты, вывучылі песьні аб Кітаі.

Дзякуючы прапрацоўцы заданьня «Аб абароназдольнасьці СССР», старэйшыя піонэры навучыліся карыстацца процівагазам, малодшыя рабіць лукі і страляць з іх у цэль. Усе піонэры запісаліся ў ТСА-авіяхім. Быў наладжан вечар ваеннай прапаганды для бацькоў і неорганізаваных дзяцей. Піонэры дэмонстравалі даклад жывымі сцэнкамі, якія складалі самі.

Напрыклад, калі дакладчык гаварыў аб паніцы ў часе вайны, падымалася заслона і піонэры ілюстравалі дзеяньнем.

Улетку мы праводзілі колектыўныя купаньні, загараньні, катаньні на лодках, прагулкі, гутаркі ля кастра. Працуе дзяткораўскі гурток і гурток кройкі і шыцьця.

Група піонэраў.

Тры тыдні пацелі над шашкамі.

(Полацак, атрад імя Варашылава, пры саюзе РКГ).

Рашыў наш атрад правесьці шашачны турнір. Савет атраду даў заданьне кожнаму зьвяну „набіць руку"—гуляць на занятках у шашкі. Тры тыдні пацелі піонэры над шашкамі. Потым кожны атрад вылучыў двух лепшых ігракоў на шашачны турнір.

Турнір праходзіў наступным чынам: прадстаўнікі трэцяга зьвяна гулялі з другім зьвяном. (Апошні выйграў). Пасьля гэтага прадстаўнікі другога зьвяна гулялі паміж сабою. (Абодва—гулялі аднолькава).

Вынікі шашачнага турніру наступныя: АТРАД ВЫЯВІЎ САМЫХ ЛЕПШЫХ ПІОНЭРАЎ, ГУЛЯЮЧЫХ У ШАШКІ, ЗАЦІКАВІЎ УСІХ ПІОНЭРАЎ ШАШАЧНАЙ ГУЛЬНЁЙ.

Цяпер гульня ў шашкі—любімыя заняткі нашых піонэраў.

З. ГАНДМАН.

„На акраіне, дзесьці гораду"...

На акраіне Менску гораду ў Камароўцы
атрад наш жыве...
(З атрадных „Цэглікаў").

Ішоў збор.

Сярод выбеленага чыстага пакою стройным карэ сядзеў увесь атрад. Справаздачу першага зьвяна аб культурным жыцьці курсаў Цэнтральнага Інстытуту Працы рабіла зусім маленькая дзяўчынка. Справаздача была кароткая, але поўная і падрабязная. Яна надзвычайна добра ахапіла дадзенае атрадам заданьне.

Калі-б справаздачу першага зьвяна пачулі «ЦІП'аўцы» з культкому, дык ніводзін з іх не ўсядзеў-бы на сходзе ад сораму. Зьвяно дасканальна высьветліла працу культкамісіі курсаў, пачынаючы ад колькасьці сяброў ячэйкі ТСА-авіяхіму і канчаючы дрэннай працай кіраўніка струннага гуртка.

Некалькі падрабязнасьцяў. 19-ты камароўскі атрад імя Дзям'яна Беднага мае за сваімі плячыма насівеўшыя гады гісторыі. Гэта гады—ад баявой рамантыкі спартакаўцаў, да ўпарта напруджаных дзён нашай сапраўднасьці, да 5—10-цірублёвага існаваньня на скудных сродках Акрбюро

Ячэйка комсамолу ЦІП'у—шэф атраду. І калі павадыр тав. Раговін запытаў: якое чарговае заданьне вы самі жадаеце выбраць? — савет атраду аднагалосна заявіў: «ЦІП!»

Работа і мэтады выхаваньня вучняў Цэнтральнага Інстытуту Працы даўно цікавілі піонэраў. І таму з такім запалам кожнае зьвяно ўзялося за вывучэньне асобных момантаў работы ЦІП'у. Цікава праводзіўся збор атраду. Сур'ёзную працу зьмяняла бадзёрыстая і вясёлая «лявоніха». Пад акампанімэнт 60 глотак і грукату барабану несьліся пары. На вуліцы застанаўліваліся праходзячыя. У шыбы ўглядаліся „неорганізаваныя", сьмешна расьціснуўшы нос і шчокі аб насінеўшае шкло. Крыху сьмялейшыя ўваходзілі ў клюб, сьціпла прабіраючыся на заднія лаўкі, сарамліва круцячы і без таго шмат пераяжыўшую шапку.



Пад акампанімэнт барабану несьліся пары.

Падыходзілі піонэры, быўшыя «неорганізаваныя», калісьці прайшоўшыя таксама цяжкую школу суровага дзяцінства, дзяцінства пакінутага і аддананага самому сабе акраіннага хлапца. Яны падыходзілі па-інакшаму, ухмыляліся, па-свойску бралі «неорганізаваных» за плечы і штурхалі ў першыя шэрагі.

«Лявоніху» зьмянілі песьні, песьні зьмяняліся справаздачай, справаздачы—ласкаючымі гукамі скрыпкі дамарошчанага музыкі, прысланага ячэйкай комсамольца.

* * *

Быў вечар. У клюбе панавала цемра, тая асаблівая прыкрая і няпрыемная цемра, калі ў памяшканьні тыднямі не паліліся печы, калі тыднямі ў ім ня было людзей.

І здавалася, што холад не дае магчымасьці запаліць сярнічкі.

Збор быў сарваны.

Паўгадзіны атрад страшэнна стукаў нагамі і, не адагрэўшыся, разышоўся па хатах. Назаўтра, ледзь золак, ў клюб прышлі тры хлапцы. Трэ' было «здабыць сьвет»,—адшукаць епал для сіратліва стаячай і чакаючай печы.

У мароз, па сьлізкаму дрэву, палезьлі яны на самае высокае, тонкае гальлё, рызыкуючы быць скінутымі ветрам на зямлю, ці апаленымі ад электрычнасьці. Яны прылучылі тонкі дрот да галоўнай магістралі. Гэта быў «+» электрычнага току, афіцыйна называемы ў падручніках фізыкі «палажыцельны полюс».

Каб гарэла ў клюбе звычайная лямпачка «ЭТЦР», трэ' было здабыць яшчэ і «—» (атрыцацельны полюс) электрычнага току. Яго знайшлі, але знайшлі далёка ў сутарэньні клюбу, недзе ў склепе, дзе праходзіла забытая вадаправодная труба.

Сьвет гарэў. Зноў закіпела ў клюбе жыцьцё.

Атрад саграваў клюб толькі сваім «дыханьнем». Печы палілі рэдка, і калі палілі—гэта было сьвята. Да позьняй ночы заседжваліся тады за радыё-прыёмнікам.

Клюб наведвала і рэгулярна наведвае і цяпер славутае хуліганьнё Камароўкі. І вось цяпер у іх можна павучыцца дысцыпліне і вытрымасьці. Хай-бы хоць адзін з іх калі-небудзь цяпер палаяўся, ці пакрыўдзіў піонэра, ці пашкодзіў-бы атраднай рабоце. Гэтага няма.

Маленькія «злодзеі» акраін, прайшоўшае «ДОПР'ы» амаль што усіх Саюзных рэспублік, цяпер гуляе разам з піонэрамі



Прыходзілі неарганізаваныя дзеці.

ў шашкі, просяць запісаць у зьвяно, мірна слухаюць радыё. Праўда, на вуліцы яны былі іншыя, але ўсё-ж піонэраў ніколі не чапаюць. Гэтым можа ганарыцца атрад. Сваёй удалай работай адарваўшы ад вуліцы падрастаючых хуліганаў, ён заваяваў аўторытэт акаляючых мас. Недарма на лягер сабралі сярод толькі адных бацькоў 40 рублёў, а на вечар, які быў наладжаны ў карысьць лягеру, прышла амаль што ўся Камароўка. Сабралі тады яшчэ 40 рублёў. Астатнія 40—далі майстры і вучні ЦІП'у).

На кожным сходзе зацьверджваюць усё новых і новых піонэраў. Усё гэта тыя, што сталі перад шыбаю, слухаючы атрадныя песьні і «лявоніху», тыя, якія выпадкова папаўшы ў клюб сталі ўдзельнікамі шашачнага турніру.

Некалькі радкоў звычайнай «хронікі». Кожны тыдзень комсамолец з АБВШ прыходзіць з вінтоўкай у камароўскі клюб. Яго сустракаюць крыкамі радасьці, садзяць за стол і першаму даюць слухаць «радыё». Да яго прыходу ўжо зроблены «глазкі»—мішэні ціру. З ім разам, весела расказаўшы аб часьцях вінтоўкі—пачынаюць страляць. (У дзесятую гадавіну Кастрычніка будзе праведзен конкурс на лепшага стралка).

Мішэні—«глазкі», як жывы доказ дасягненьняў і посьпехаў захоўваюць у гістпарце атраду разам з загадамі і цыркулярамі штабу БДЮС (Спартакоў). Атрад мае такі куток гісторыі організацыі, дзе апрача матар'ялаў спартакаўцаў, маюцца ўсе ўласныя матар'ялы атраду.

Трэба сказаць некалькі слоў аб перарастках у атрадзе. Работа з імі цалкам здавальняе іх. Усе старэйшыя піонэры—ужо комсамольцы, яны павадыры зьвеньняў, ім у атрадзе даручаюць цяжкую работу (устаноўка радыё і інш.). А калі работа цяжкая, дык яна і цікавая. Хлапцы працуюць і у вайсковым гуртку.

Зараз атрад паставіў задачу—пабудаваць сталярную майстэрню. Задача цяжкая. Атрад атрымоўвае 5 руб. толькі ад акругкому ЛКСМБ. А ў апошнія месяцы бюджэт скараціўся да 3-х руб. І вось на гэтыя грошы трэба ўтварыць сталярную майстэрню. На тым, як камароўскія піонэры організоўваюць цяпер гэтую майстэрню можа павучыцца кожны піонэрскі атрад. Атрад ведае, што грошай няма, будзе і хлапцы зьбіраюць дзе магчыма інструмант, у хаце, у знаёмых. Зламаныя інструманты пачыняюць майстры ЦІП'у, даюць самі, што могуць. Вось як будзе пабудавана сталярная майстэрня.

Яшчэ невялічкі ўзор. На адчыненьне клюбу было дадзена 5 рублёў. На 5 рублёў—пакладзены палавіцы, устаўлены шыбы, зроблены шашкі, куплены шахматы, утворана выстаўка насьценгазэт, зроблен куток гісторыі організацыі, прыбран клюб.

Складалі палавіцы і ўстаўлялі шыбы самі піонэры.

Вось дзе трэба вучыцца работаць тым, хто заўсёды плача: «няма грошай—развальваецца праца». 5-цірублёвае існаваньне—гэта паказальнік моцнасьці і трываласьці піонэраў.

Ал. Кал.

Багаты ўраджай, таварыш, сустрачай!

ДЗЕСЯЦЬ ГОД ЧЫРВОНАГА КАСТРЫЧНІКА НА СЯЛЯНСКІМ ПОЛІ.

Задубская комсамольская ячэйка адчыняе машыннае таварыства.

Конкурс вясковых ячэек пакажа, як моладзь навучылася організоўваць сьвята працоўных.

„Пасяджэньне Малога Савнаркому“.

Сёньняшнее пасяджэньне камісіі пры Беразоўскай ячэйцы комсамолу па правядзеньні 10-цігодзьдзя Кастрычніка было нязвычайным, ніколечкі не падобным на ранейшыя пасяджэньні, вельмі ажыўленым і працяжным.

Кастусь Кульгавы, як ужо ўсе пытаньні былі разгледжаны і хлопцы выходзілі з хаты-чытальні, прыемна пацягнуўся, натужыў цягліцы на правай руцэ і скрозь зубы працадзіў:

— Сёньня наша пасяджэньне, як у Малым Савнаркоме.

Таварышы дружна зарагаталі з Кастуся, а Янка скрозь рогат адрывіста выказаў:

— Таго Савнаркому, дзе старшыня—Кульгавы Кастусь...

Ажыўленым і цікавым пасяджэньне было таму, што камісія разглядала пытаньне, **як найлепш падрыхтавацца да вялікага юбілею Кастрычніка і гэтым самым забясьпечыць сабе пачэсны ўдзел ва Ўсебеларускім конкурсе вясковых ячэек на лепшую адзнаку гэтага сьвята.**

... Хлопцы гаварылі не „наогул“, не пра неабходнасьць рыхтавацца, а кожнае слова—практычная прапанова.

Камісія даручыла Янку—кіраўніку вайсковага гуртка—падрыхтаваць моладзь да дэманстрацыі.

Кастусю Кульгаваму, як гарманісту—згуртаваць музыкаў і сыграцца.

Тодараваму Кірылу—найлепшаму танцору ў сельсавеце—падрыхтаваць „барыню“, „лявоніху“ і іншыя скокі.

Марысі—„сьпецца“ з дзяўчатамі і падрыхтаваць некалькі нумароў для выступленьня на вечары.

Яўхіму і Тарасу, сумесна з іншымі комсамольцамі, правесьці ўвабраньне клюбу, хаты-чытальні, а таксама і ўсяе вёскі. Ім-жа даручаецца прасачыць, каб усе комсамольцы ўпрыгожылі свае хаты і двары.

Папрасіць Данілу—вясковага настаўніка, падрыхтаваць невялічкую п'еску і колектыўную дэклямацыю вучняў...

Яшчэ пасяджэньне ня скончылася, а таварышы ўжо думалі, як лепш узяцца за работу, каб не падкачаць перад таварышамі, каб да чарговага пасяджэньня камісіі былі ўжо першыя вынікі.

Гарошык.

Нядзельнік для пашырэньня мэліорацыі.

(Стахаўская ячэйка ЛКСМБ, Барысаўскі раён).

Комсамольцы правялі гутарку з сялянскай моладзьзю аб тым, як **лепш дапамагчы ўзмацненьню Стахаўскага мэліорацыйнага таварыства.** Было вырашана наладзіць **нядзельнік.**

На другі дзень, 2-га кастрычніка, сабралася амаль уся моладзь вёскі, некалькі дарослых сялян і сумесна з комсамольскай ячэйкай, дружнай грамадою накіраваліся да балота.

За некалькі гадзін стараннай працы па балотнай прасторы мэліорацыйнага таварыства **«Пачын» чорнай і стужкай вызначалася канава даўжынёю у 50 мэтраў.**

Акрамя матар'яльнай дапамогі мэліорацыйнаму таварыству, аказанай праведзеным нядзельнікам, **комсамольская ячэйка лішні раз даказала, як можна многа зрабіць дружным колектывам.**

Т, Качан.

Нашы дасягненьні да Дню Ураджаю.

(Вільшчынская Ш. С. М).

Леташні год наша Ш. С. М. на раённай выстаўцы атрымала ганаровы дыплём.

Калі летась сярэдні збор жыта быў **60 пудоў з дзесяціны,** то сёлета з **дзесяціны ў сярэднім** нажыналі 93 пуды, некаторыя асобныя дзесяціны далі да 100 пудоў ураджаю. Хутка і Нямеччыну дагонім.

Наша капуста сёлета зноў будзе красавацца першай па раёне. Летась мы на капусьце шкоднікаў ня бачылі, а сёлета з імі вялі барацьбу. Улетку прышлося бараніцца ад мошкі капуснай, увосень ад вусеню. Капусту пасыпалі попелам і палівалі рашчынай парыскай зеляні. На гародзе мы таксама не адсталі ад другіх.

Парасла добрая морква і іншая гароднiна.

Варта і іншым акруговым ШСМ падзяліцца сваімі дасягненьнямі на старонках «Чырвонай Зьмены». **М. Маркевіч.**



Колектыўна набываем машыны.

(Прапойск, Магілеўская акруга).

За апошні год наша Прапойскае крэдытнае таварыства значна разгарнула сваю працу. Дзякуючы таварыству, сяляне атрымалі на 5.300 рублёў сельска-гаспадарчых машын і прыладаў. **Амаль усе машыны куплены сялянамі колектыўным парадкам: па 4-5 чалавек, а часам і цэлымі вёскамі набываліся больш дарагія сельска-гаспадарчыя машыны.**

Больш беднаму сялянству былі **дадзены ільготы і рассрочка ў выплаце. Вяскоўцы вельмі добра адносяцца да крэдытнага таварыства, бачачы, што яно імкнецца палепшыць сялянскія гаспадаркі.** **М. Г.**



Рыхтуем два падарункі

(Задубская ячэйка ЛКСМБ, Кармянскі раён, Магілеўшчына).

У якасьці падарунку 10-х годзьдзю Кастрычніка, Задубская ячэйка ЛКСМБ стварае пры мясцовым сельска-гаспадарчым коопэратыве машыннае таварыства.

Ужо набыта некалькі машын: радавая сеялка, спружынная барана і парны плуг.

Ячэйка комсамолу дадае да гэтага сваю малатарню, атрыманую ў якасьці прэміі на конкурсе. Адчыненьне таварыства адбудзецца 7-га лістапада.

Другім нашым падарункам Кастрычніку—пашырэньне падпіскі на комсамольскія і партыйна-савецкія газэты і часопісі. Гэту кампанію праводзім з 1-га па 20-ае кастрычніка. **Н. Купрэеў.**

Тры фунты адна морква.

(Прапойск, Магілёўская акруга).

Некалькі год таму назад мае бацькі саджалі моркву простым «вясковым» спосабам (сеялі). Вынікі ад такога пасеву атрымоўваліся самыя дрэнныя: морква вырастала таўшчынёй ня больш пальца (на фунт ішло каля 40 штук).

Сёголетняй вясною я пачаў **сеяць моркву так, як вучыў гэтаму агрономом у школе сялянскай моладзі.**

Я падрыхтаваў глебу на тым-жа самым месцы, дзе раней зусім прападала морква. Потым зрабіў грады, на якіх прагнаў чатыры маленькія баразёнкі. Пасадку рабіў ад рукі.

Пасьля пасеву, калі пачалі паказвацца ўсходы, адначасова з морквай выраслі сьмяцьцёвыя травы, якія я зараз-жа зрываў. Калі націньне морквы паднялося да 3 вяршкоў вышыні, я ўтварыў першае прарэджваньне. Другое прарэджваньне зрабіў пасьля двух тыдняў. Гэты раз прарэджваньне было на 3-4 вяршкі адна морка ўка ад другой. У такім выглядзе я і пакінуў свае грады да канца восені.

У сухія дні рабіў паліўку. Пасьля паліўкі грады пасыпаў сухой зямлёю. Гэта я рабіў для таго, каб не зьяўляліся корані на версе глебы.

Калі расьліны крыху падрасьлі, паліў іх жыдкім угнаеньнем, прыгатаваным з птушынага памёту.

Парасла морква вельмі вялікая: **адзін корань важыў 2-3 фунты, што ў мінулыя гады нікому і ня сьнілася.**

Міхайла Ганчароў.

Будуем новае жыцьцё.

(Путчынскі сельсавет, Меншчына).

Доўга не маглі нашы сяляне зразумець усяго таго, што стварылася ў Кастрычнікавую рэволюцыю. Дзіва было, калі скінулі цара і пачалі кіраваць усім жыцьцём самі рабочыя і сяляне. Цяпер нашы сяляне і моладзь іншымі сталі і пачынаюць ужо заводзіць культуру і новае жыцьцё ў вёсцы.

У цэнтры сельсавету організавалі с-гаспадарчае таварыства, дзе пайшчыкамі зьяўляюцца большай часткай маладыя гаспадары. Таварыства дае ў крэдыт грошы, **дзякуючы якім беднота і батракі паляпшаюць свае гаспадаркі. Праз таварыства сялянства набывае розныя сельска-гаспадарчыя машыны.**

Акрамя гэтага, у таварыства ёсьць дзьве спажывецкія крамы. Адна з іх у цэнтры сельсавету, у былым маёнтку Татаршчына, а другая ў вёсцы Скарабагатаўшчына. Гэтыя крамы забясьпечваюць сялян усім патрэбным таварам і ў сялян **скупліваюць рознае сыр'ё: шчаціну, кару, анучы і г. д.** Пры сельсавеце працуе вялікая хата-чытальня у якой ёсьць шмат газэт і кніг, у якой, і моладзь разам з старымі праводзіць свой вольны час за газэткай, кніжкай.

Моладзь цяпер вельмі жадае даведацца з газэты аб тым, што творыцца на сьвеце. Напрыклад, маладыя гаспадары вёскі **Валоўнікі** выпісваюць шмат газэт, організавалі „Чырвоны Куток“, які ў будучым перародзіцца ў хату-чытальню. Раней моладзь гэтым ня цікавілася.

У сельсавеце—ячэйка ЛКСМБ. Апошняй трэба толькі узмацніць выхаваўчую працу сярод моладзі.

Для дзяцей пасьля Кастрычніка ў раёне нашага сельсавету адчынена **пяць новых школ.** Раней была ўсяго **адна.** У гэтых школах вучацца ўсе сялянскія дзеці. Вучні Гаўтапольскай школы кожнае рэволюцыйнае сьвята праводзяць урачыста ў клюбе разам з сваімі бацькамі. Ёсьць у нашым сельсавеце організаваная моладзьдзю пажарная дружына.

Сяляне, асабліва моладзь, стараюцца апрацоўваць сваю зямлю па новаму, як вучылі на сельска-гаспадарчых курсах агрономы.

Ужо культ-травы занялі палавіну сялянскіх палеў, уводзяцца карняплоды, сеецца пад угнаеньне лубін, глебу таксама угнойваюць штучным угнаеньнем, стараюцца засяваць чыстым адсартаваным насеньнем. Сады даглядаюцца пад кіраўніцтвам агрономаў. Асабліва ў гэтым адзначаецца вёска Валоўнікі.

Акса.



Міжнародны агляд.

Тры зьезды.

Кіраўніцтва ангельскай рабочай партыяй знаходзіцца ў руках згоднікаў.—Рабочая партыя імкнецца пакласьці соцыялізм у дамавіну.—Здрадніцкая політыка лідэраў рабочае партыі разьвязвае рукі консэрватарам.—Сапраўдным абаронцам рабочых зьяўляецца комуністычная партыя.

Зьезд ангельскіх згоднікаў.

У мінулы тыдзень у горадзе Блэкпулі (Англія) адбыўся зьезд ангельскай рабочай партыі.

Па сваёй програме, а яшчэ больш па дзеях, гэтая партыя нічым не адрозьніваецца ад іншых соц.-згодніцкіх партый.

Аднак роля рабочай партыі ў соцыяльным руху Англіі вялікая.

Яна зьяўляецца ў цяперашні час найбольш важнай політычнай організацыяй ангельскай рабочай клясы.

З гэтай прычыны яе зьезд павінен быць не малым здарэньнем для рабочага руху.

Але раней чым казаць аб зьезьдзе, неабходна, каб ня было блытаніны, сказаць некалькі слоў аб організацыйнай пабудове гэтай партыі, бо бяз гэтага цяжка зразумець яе ролю і значэньне.

Без політычнай програмы.

Большая частка рабочай партыі, амаль на 95 процантаў, складаюць рабочыя організацыі, якія ў яе ўваходзяць.

У рабочую партыю цалкам уваходзяць ангельскія трэд-юніёны (профсаюзы). У яе ўваходзіць незалежная рабочая партыя Англіі.

Розныя другія так званыя соцыялістычныя організацыі і нават рабочыя коопэрацыйныя організацыі.

Такім чынам ангельская рабочая партыя зьяўляецца аб'яднаньнем самых рознакалёрных організацый.

Якая мэта аб'яднаньня гэтых організацый? Што галоўнае ў пляне дзейнасьці рабочай партыі?

Галоўнай задачай рабочай партыі зьяўляецца абарона інтарэсаў рабочых у парляманце.

Яна вылучае кандыдатаў на выбарах, праводзіць агітацыйную кампанію ў часе выбараў, кіруе дзейнасьцю рабочых дэпутатаў у парляманце і г. д.

Проста кажучы, рабочая партыя ёсьць організацыя, якая павінна абараняць усе політычныя і экономічныя інтарэсы рабочай клясы.

Але кіраўніцтва рабочай партыяй, з самага пачатку яе існаваньня, знаходзіцца ў руках згоднікаў.

На чале партыі стаяць здраднікі—«правадыры» як Макдовальд, Томас, Гендэрсон.

Гэтыя «правадыры» з пенай ля роту даказваюць неабходнасьць міру і сяброўства з капіталістымі.

Імкнуцца зрабіць усё, каб адхіліць рабочых ад рэволюцыйнай барацьбы супроць буржуазіі.

Гэтыя здраднікі робяць усякія палёгкі ў справе барацьбы капіталістых супроць СССР, супроць кітайскай рэволюцыі.

Яны нічога ня робяць, каб адхіліць небясьпеку новай вайны.

Іх мэта разброіць ангельскі пролетарыят у яго барацьбе за паляпшэньне свайго становішча.

І цікава, што ўсю гэту крывавую справу яны праводзяць пад сьцягам абароны інтарэсаў рабочых.

На словах яны супроць закону аб профсаюзах, супроць разрыву з СССР.

Але тут-жа патрабуюць, каб рабочыя не вялі барацьбы рэволюцыйным шляхам.

Нават яснай політычнай праграмы рабочая партыя ня мае.

Яна зьяўляецца зброяй у руках самых правых, самай згодніцкай вяршынкі рабочай клясы.

Досыць сказаць тое, што адзіная, да канца рэволюцыйная партыя рабочай клясы Англіі—ангельская комуністычная партыя да гэтага часу не магла дамагчыся ўваходу ў рабочую партыю.

У той час, як у рабочай партыі знаходзяцца самыя контр рэволюцыйныя элемэнты—правадыры партыі ні якім чынам ня хочуць дапусьціць туды комуністых.

Комуністы, аднак, скарыстоўваюць усякую магчымасць, каб весьці сваю працу ў рабочай партыі, каб на яе чале было рэволюцыйнае кіраўніцтва і каб рабочая партыя зрабілася сапраўднай рэволюцыйнай зброяй рабочай клясы.

Усякае рэволюцыйнае слова сустракае адпор.

Зьезд рабочай партыі адбываўся ў той момант, калі ангельскі імпэрыялізм вядзе шалёную кампанію да вайны. Ён сабраўся пасьля разрыву Англіі з СССР, пасьля прыняцьця закону супроць трэд-юніёнаў.

Але зьезд яшчэ больш замацаваў здрадніцкую лінію «правадыроў» ангельскага рабочага руху.

Чытач памятуе Эдынбургскі зьезд ангельскіх профсаюзаў, які чорнай старонкай увойдзе ў ангельскі рабочы рух.

Гэты зьезд сарваў англа-расійскі профсаюзны камітэт.

Па пратоптаным шляху эдынбурскага зьезду пашоў зьезд рабочай партыі.

Ён толькі яшчэ раз паказаў, што **галоўнай задачай згодніцкіх правадыроў зьяўляецца барацьба супроць рэволюцыі Здрада інтарэсаў рабочых. Абарона буржуазіі.**

Для характарыстыкі зьезду досыць сказаць, што з рабочай партыі, на першых пасяджэньнях, быў выключаны саюз настаўнікаў за тое, што ён быў надта рэволюцыйны, што ў ім быў моцны комуністычны ўплыў.

Усякае рэволюцыйнае слова сустракае рашучы адпор згоднікаў.

Зьезд у Блэкпулі ня ўнёс нічога новага ў сучаснае становішча рабочага руху Англіі.

Адыграўшы такую-ж контр-рэволюцыйную ролю, як і Эдынбурскі—ён зачыніўся.

Цікава тое, што нават буржуазны друк Англіі аб зьезьдзе рабочай партыі адклікаецца з насьмешкай.

Адна газэта піша: «Пытаньне аб падатках на капітал, якім калісь займалася рабочая партыя, зараз пакінута. Што-ж датычыцца соцыялізму, дык рабочая партыя наогул імкнецца пакласьці яго ў дамавіну».

Відавочны вораг.

У той час, калі яшчэ «працаваў» зьезд ангельскай рабочай партыі, у другім горадзе сабраўся зьезд сучасных «гаспадароў» Англіі. Зьезд ангельскай консэрватыўнай партыі.

Сабраўся зьезд партыі Чэмбэрлена і Бальдвіна, Чэрчыля і Біркэнхэда, партыя лёрдаў—буйнейшых капіталістаў і зямляўласьнікаў.

Яны сабраліся для таго, каб абгаварыць, як лягчэй замацаваць ім сваё ўладаньне Англіяй.

Консэрватары сабраліся, каб вызначыць, якім шляхам весьці і надалей сваю імпэрыялістычную палітыку.

Як лепш падрыхтаваць новую вайну. Як найлепей весьці барацьбу з СССР. Як забараніць і захаваць сваё панаваньне ў калёніях і Кітаі.

Яны сабраліся для таго, каб вызначыць, якім чынам весьці барацьбу супроць рабочае клясы Англіі.

Зьезд з вялікай радасьцю вітаў урад за разрыў з Савецкім Саюзам і за тое, што ўрад правёў у парляманце закон супроць ангельскіх профсаюзаў.

Больш за ўсё зьезд здаволены тым, што ўрад прыняў закон аб пераважнасьці консэрватараў у парляманце.

— «Так ці іначай,—кажа адзін з консэрватараў,—але мы павінны дабіцца таго, каб пасьля 1929 (выбары ў парлямант) году наша краіна кіравалася консэрватыўным урадам».

Вось іх жаданьне.

Наогул, кожнаму зразумела, што гэта—зьезд самых злосных ворагаў рабочай клясы.

Калі «правадыры» рабочай партыі Англіі зьяўляюцца патаемнымі ворагамі пролетарыяту, дык консэрватары—яго відавочны вораг.

Для таго, каб зьнішчыць ворагаў у рабочым руху, каб аб'яднаць рабочых у барацьбе з капіталам, каб вызначыць шлях вызваленьня працоўных Англіі, сабраўся IX зьезд ангельскай комуністычнай партыі.

Таварыш Хорнэр, вітаючы зьезд ад імя ЦК, заявіў: «У мінулым годзе комуністычны рух Англіі меў вялікую атаку з боку капіталістых. Вышэйшым пунктам нападак зьяўляецца закон супроць профсаюзаў».

Хорнэр адзначыў, што небясьпека вайны, у зьвязку з разрывам Англіі з СССР, павялічылася.

«Партыя—сказаў Хорнэр,—павінна зрабіць усё, каб перасьцерагчы рабочых ад небясьпек, якія зараз існуюць». Комуністычная партыя ўвесь час вывырачвае на верх здрадніцкую політыку рэформістых. Яна стаіць на чале ўсіх чэсных рэволюцыйных організацый Англіі.

Яна кіруе сапраўдным пролетарскім рухам. Комуністычная партыя сочыць за кожным крокам сваіх ворагаў.

Яна вядзе рашучую барацьбу з соцыял-згоднікамі і буржуазіяй.

У гэтай сваёй барацьбе комуністычная партыя мае шмат перамог.

Алёнін.

Комсамольская пераклічка.

Старонка з газэты ЦК КСМУ „Комсамолец Украіны“, прысьвечаная Беларусі і працы ЛКСМБ. У адным з нумароў „Чырвонай Зьмены“ выйдзе старонка Комсамолу Украіны.


Савецкая Беларусь
БРАТЕРСЬКИЙ ПРИВІТ
Від гніту до світлого життя
РОКИ РОЗБИТУ КРАЇНИ
ЗАВОЮЄМО БОЛОТА
Білорусь комсомольська
ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Братэрскае прывітаньне рэдакцыі «Комсамолец Украіны».

Шчыра вітаем ваш пачын. Пераклічка газэт нашых рэспублік—найлепшы спосаб узаемнай сувязі і абмену вопытам.

Братэрскае прывітаньне суседу—Комсамолу Украіны!

Сакратар ЦК ЛКСМБ БАРАНЬНІКАЎ.

Адбыўся пленум Менакругкому ЛКСМБ.

Зьмены ў складзе бюро.

6-7 кастрычніка адбыўся чарговы пленум Менакругкому ЛКСМБ.

Пленум заслухаў наступныя даклады: аб політычным становішчы ў краіне (тав. АКУЛІК), вынікі пленуму ЦК ЛКСМБ (тав. БАРАНЬНІКАЎ), даклад Акрбюро ЮП (т. ІЛЬЛІН), справаздачу конфліктнай камісіі АК (тав. САДОЎСКІ), інформацыю тав. КУРЦІКА аб усебеларускім суботніку працоўнай моладзі і конкурсе вясковых ячэек на лепшую падрыхтоўку да сьвята Кастрычнікавай рэволюцыі.

Пленум унёс наступныя зьмены ў склад бюро Менакругкому ЛКСМБ: замест уходзячага на работу ў ЦК тав. ШАЛІМЫ, новым сакратаром Менакругкому абраны тав. КРАСОЎСКІ (былы сакратар Магілеўскага АК).

Замест вызваленага ад работы, згодна асабістай заяве, тав. РУБІНА новым загадчыкам оргаддзелу абраны тав. ШНЭЙДАР.

Старшынёй экономкамісіі Менакругкому ЛКСМБ абраны былы сакратар Койданаўскага РК тав. САДОЎСКІ П.

Студэнт ваенізуецца.

У мэтах узмацненьня ваенізацыі студэнцтва, праўленьне БДУ пастанавіла ўвесьці на ўсіх факультэтах практычны курс вайсковай справы.

На пашырэньне стралковага ціру і вайсковага габінэту новымі прыладамі і ваеннай літаратурай адпушчаецца 2.000 рублёў.

У гэтым годзе пры БДУ будзе існаваць шэраг вайсковых гурткоў: тактычна-стралковы, першай дапамогі, хэмічна-газавы і авіяхім-каманды.

Вытворчыя конфэрэнцыі.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў склікаць у лістападзе бягучага году ўсебеларускія вытворчыя конфэрэнцыі па розных галінах прамысловасьці—скуранай, мэталёвай, дрэваапрацовачнай, хэмічнай і г. д.

Конфэрэнцыі павінны абмеркаваць шляхі і мэтады рацыяналізацыі вытворчасьці на сваіх прадпрыемствах.

Ліквідуецца беладдзяленьне Цэнтрасьпірту.

НКРСІ БССР правёў абсьледваньне дзейнасьці беларускага аддзяленьня Цэнтрасьпірту СССР.


У выніку абсьледваньня устаноўлена, што назіраецца значны паральлелізм у працы паміж Белдзяржсьпіртам і Цэнтрасьпіртам. Акрамя таго, існаваньне апошняга ня выклікаецца гаспадарчай неабходнасьцю і прыносіць дэфіцыт.

НКРСІ ўзьняў пытаньне аб ліквідацыі беладдзяленьня Цэнтрасьпірту і аб'яднаньні яго з Белдзяржсьпіртам, што дасьць вялізную экономію сродкаў.

Узмацніць беларусізацыю.

ЦСПСБ прапанаваў усім ЦП саюзаў узмацніць работу па беларусізацыі саюзных мас, асабліва профактыву.

Дзеля гэтай мэты належыць організаваць шырокую сетку курсаў па вывучэньні беларускай мовы, папоўніць склад рабочых бібліотэк беларускай літаратурай, забясьпечыць прадстаўніцтва ў саюзных органаў беларусаў (там, дзе яны складаюць асноўную масу членаў саюзу).



„Палкае юнацтва.“

(Кіно «Спартак»).

Юнацтва гэтага фільму досыць падазронае. Фільм напэўне створаны ў першыя гады працы кінематографу. Аб гэтым кажуць цёмныя здымкі, першабытная тэхніка кіно-пастаноўкі і тое, што фільм на кожным кроку рвецца.

І нават зьмест прыпамінае фільмы старога „Ханжонкаўскага кінематографу“. Любоўная трагэдыя, пакараньні сьмерцю авантурыста-князя, забойствы—усё гэта музэй старых кіно-традыцый.

Не на вышыні і гульня артыстых. Іх мёртвыя твары зусім не даюць прадстаўленьня аб „палкім юнацтве“.

Разьлічаны на сьлёзы абывательскага гледача, гэты фільм зусім нічога ня варты і не карысны для нашай моладзі.

А—кі.

Куды пайсьці?

У памяшканьні кіно-тэатру **„Культура“** 2 апошнія гастролі **Маскоўскага Яўрэйскага Камэрнага тэатру**. Сёньня ставіцца—„З яўрэйскія ізюмінкі“. Заўтра—**„Падарожжа Веніаміна 3-га“**.

У кіно-тэатрах пачынаюць дэманстравацца наступныя кіно-фільмы: „Інтэрнацыянал“—**„Асуджоныя“**; „Пролетары“—кіно-комэдыя з удзелам Ігара Ільлінскага **„Чашка гарбаты“**; „Чырвоная Зорка“—фільм з быту яўрэяў у 1905-м годзе—**„Мабул“** (з удзелам артыстых Маскоўскага Тэатру „Габіма“.

1 Белдзяржтэатр у Віцебску.

7-га кастрычніка 1-шы Белдзяржтэатр распачаў зімні тэатральны сэзон у Віцебску п'есай **„Кастусь Каліноўскі“**. На першыя пастаноўкі тэатру („Каваль Ваявода“, „Кар'ера таварыша Брыкгаліна“, „Кастусь Каліноўскі“ і „Мяшчанін у шляхэцтве“ — усе білеты былі прададзены.

ГАДАВІНА КОМСАМОЛЬСКАГА ШЭФСТВА.

5 год таму назад, 16-га кастрычніка 1922 г., мы прынялі шэфства над марфлётам.

Дасягненьняў у гэтай справе мала.

„Сувязь з маракамі трэба палепшыць“.

Акругі заварушыліся.

Запазычанасьць па ўзносах на карысьць марфлёту будзе ліквідавана.

Віцебскі акругком у бліжэйшыя дні організоўвае вялікі агульна-гарадзкі спэктакль у адзнаку 5-й гадавіны шэфства над флётам. Усе сродкі ад вечару паступяць у чырвонафлёцкі фонд.

У **Магілеўскай** акрузе распачалася кампанія падагульненьня і папулярызацыі работы па шэфству над флётам. Дзень 5-й гадавіны шэфства будзе адзначан спэцыяльнымі сходамі і вечарамі, прысьвечанымі марфлёту і сувязі Магілеўскай арганізацыі з ім.

Да сьвята рыхтуецца пасылка вялікай партыі падарункаў падшэфным маракам.

Мазырскі акругком пастанавіў тэрмінова ліквідаваць запазычанасьць акруговай організацыі па марскіх узносах.

Усе ячэйкі заняліся зборам грошай і падарункаў на карысьць чырвона-флётцаў. Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі мяркуецца ўсю запазычанасьць пакрыць і пераслаць грошы падшэфнаму лінкору праз ЦК ЛКСМБ.

Ад астатніх акруг яшчэ не паступіла ніякіх вестак аб зборы чырвонафлёцкіх узносаў, акрамя таго, што Аршанскі АК „даручыў свайму АПА выпрацаваць плян правядзеньня шэфскага дню“ і што Менакругком „разьмеркаваў тры тыдні таму назад, усю сваю запазычанасьць паміж ячэйкамі і райкомамі акругі“.

З.

Ад абежніка да абежніка.

Існуе ў Менску **комсамольская ячэйка пры саюзе Нархарч**. Над флётам ячэйка шэфствавала калісьці, гады 3-4 таму назад... Сёлета шэфства над флётам—даўно пазабытая справа... Толькі вясною, у парадку кампаніі, хлапцы прымалі ўдзел у дасылцы падарункаў чырвонафлётцам. З падарункамі адаслалі і ліст.

— Ну, а як зараз?—Зараз сакратар зноў успомніў наконт шэфства, бо... з райкому прышоў абежнік аб гэтым.

— А што-ж рабілі раней, да абежніку?—Нічога.

Хіба ён, сакратар, і ўся ячэйка могуць заўсёды помніць аб тым, што комсамол шэфствуе над морфлётам?

Вось сакратар **ячэйкі фабзавучу друкароў** так і кажа: „Мы-б вялі шэфскую работу, калі-б райком даў аб гэтым указаньні“.

Ячэйку мэталістых не пасьмейце лаяць. Яна „цікавіцца“ шэфствам над флётам, яна нават... упаўнаважанага па гэтай працы вылучыла.

Дык можа гэтая ячэйка ўнесла шэфскія ўзносы?—Не, нічога падобнага!

Яна, бачыце, толькі „цікавіцца“.

Таксама актыўныя ў галіне шэфства **ячэйкі агульна-адукацыйных курсаў і харчавых заводаў**. Яны і словам не абмоўвіліся наконт гэтай „мізэрнай“ работы.

* * *

У 1923 годзе 4 комсамольцы з **ячэйкі заводу „Энэргія“** добраахвотнікамі паехалі ў флёт.

На провадах комсамольцы ячэйкі шмат цёплых слоў гаварылі, абяцалі заўсёды падтрымліваць сваіх таварышоў.

Прайшоў час. 4 адважныя комсамольцы сталі добрымі чырвонафлётцамі, у ячэйку „Энэргіі“ падуў прахладны ветрык з Балтыцкага мора, прынесшы з сабою першы ліст ад комсамольцаў-матросаў.

Адразу-ж напісалі адказ.

Але перапіска ішла нядоўга.

У хуткім часе ячэйка абарвала сваю сувязь з маракамі... Так, абрыдла...

* * *

Надыходзіць гадавіна ўзяцьця комсамолам шэфства над Чырвоным флётам. Шмат хто з комсамольцаў аб гэтым і ня ведае.

Адна толькі ячэйка ВНУ мяркуе адзначыць гадавіну спэцыяльным марскім вечарам.

Успомнім пра наш шэфскі абавязак, у дні слаўнага юбілею ажывім сувязь з вартаўніком савецкіх межаў—Чырвоным марскім флётам!

М. ЗАК.



Кастрычнік ідзе.

Першы ў БССР.

Белсельтрэст прыстасоўвае да 10-цігодзьдзя Кастрычніка закладку **вялікага заводу па пераапрацоўцы садавіны, першага ў БССР.**

Завод будзе гатовы ў другой палове 1928 году. Пабудова яго абыйдзецца ў 110.000 рублёў.

Выпуск вайсковых гурткоў.

Цэнтральны савет ТСА-авіяхіму БССР прыстасоўвае да Кастрычнікавых урачыстасьцяў выпуск вайсковых і санітарных гурткоў, а таксама авіяхэмічных каманд.

У часе сьвята будуць распаўсюджвацца юбілейныя значкі—„ТСА-авіяхім і 10-цігодзьдзе Кастрычніка“, увесь збор ад якіх паступіць у фонд абароны краіны.

За санітарную асьвету.

Пад лёзунгам „вайскова-санітарную асьвету—насельніцтву“ рыхтуецца да Кастрычнікавага сьвята беларуская організацыя „Чырвонага Крыжу“.

У дні сьвята будуць адчынены курсы інструктароў гурткоў першай дапамогі і школа мэдычных сясьцёр.

Праводзіцца конкурс з прэміямі на лепшую ячэйку „Чырвонага Крыжу“

Да Кастрычніка па ініцыятыве ЦК „Чырвонага Крыжу“ у акругах адчыняецца шэраг установаў—дыспансэраў, амбуляторый і лазьняў.

Закладка паравога катла.

Рабочыя Менскага заводу „Красная Заря“ адзначаюць 10-цігодзьдзе Кастрычнікавай рэволюцыі ўрачыстым адчыненьнем новага дражджавога цэху, абсталяванага па апошняму слову тэхнікі.

Акрамя таго, адбудзецца **закладка новага вялікага паравога катла**, які дасьць магчымасьць зьнізіць сабекошт прадукцыі і павысіць вытворчасьць працы.

Атрымаюць прэміі.

Закончваецца конкурс на лепшы ў БССР камітэт сялянскай узаемадапамогі. У конкурсе удзельнічаюць 10 проц. усіх камітэтаў.

Выдача прэмій лепшым камітэтам у выглядзе сельска-гаспадарчых прылад на агульную суму 4390 рублёў прыстасоўваецца да Кастрычнікавых сьвят.

Дапамога інвалідам грамадзянскай вайны.

У адзнаку 10-цігадовага юбілею Кастрычніка, Народны Камісарыят Соцыяльнай Забясьпекі асыгнаваў 3100 рублёў на разьмеркаваньне іх сярод інвалідаў грамадзянскай вайны.

Якая ў нас лепшая школа?

Да Кастрычнікавых сьвят Наркамасьветы праводзіць усебеларускі агляд працы школ. Лепшая школа атрымае назву „ІМЯ КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВОЛЮЦЫІ“.

Пры аглядзе зьвяртаецца ўвага на пастаноўку вучэбнай справы, дысцыплінаванасьці, самакіраваньне вучняў, працу форпосту і г. д.

Значок савецкага школьніка.

Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі выпушчаюцца спэцыяльныя нагрудныя значкі для вучняў савецкіх школ.

Саўнарком БССР прадаставіў цэнтральнай дзіцячай камісіі монопольнае права на распаўсюджваньне гэтых значкоў.

Піонэрская інсцэніроўка.

Піонэрская організацыя Акцябрскага раёну падрыхтоўвае да сьвята Кастрычніка інсцэніроўку аб дасягненьнях рабочай клясы СССР і становішча пролетарыяту ў капіталістычных краінах.

У тры радкі.

○ Наркамат Аховы Здароў'я пастанавіў вызваліць студэнтаў, якія канчаюць Мэдфак БДУ, ад абавязковага практычнага стажу.

○ **Белсельбанк** намеціў правесьці ў БССР **месячнік дапамогі бядняцкім гаспадаркам.**

○ У Віцебску адчынілася новая сельска-гаспадарчая профтэхшкола па засеве і перапрацоўцы тэхнічных культур.

○ У Астрашыцкім Гарадку, Менскай акругі організаваны сухотны саваторы для сялян.

○ З **Палесься зьвярнулася экспэдыцыя** Інбелкульту па вывучэньні **сельскай гаспадаркі паўдвёвых мясцовасьцяў у БССР.**

Савнарком Беларусі адпусьціў 5 тысяч **рублёў на дапамогу папярпеўшым ад крымскага землязрыгу.**

○ 5-га кастрычніка ў Менску адчыніліся ўсебеларускія курсы настаўнікаў — грамадазнаўцаў.

○ **У Менскі вячэрні комвуз прынята сёлета 100 новых слухачоў.**

○ **Адчынілася школа фабрычна-заводзкага навучаньня пры Барысаўскім шклозаводзе імя Домбаля.**

○ **Колькасьць месц у вячэрнім рабочым унівэрсытэце пры БДУ павялічана з 120 да 150.**

○ 9-га кастрычніка, пасьля доўгага рамонту, **адчыніўся цэнтральны дом працаўнікоў асьветы БССР.**

○ НКАЗ асыгнаваў **тысячу рублёў на організацыю ў акругах выставак аховы здароўя рабочых.**

○ У Бабруйскай акрузе **рэалізавана аблігацый дзяржаўнай пазыкі індустрыялізацыі на 50.000 рублёў.**

○ За першую палову 1927 году ў БССР здарылася **3965 пажараў, за якія выплачана страхоўкі на 700,000 рублёў.**

○ Прэзыдыум акрвыканкому асыгнаваў **на грамадзкія работы ў Менску ў 1927-28 годзе 198.000 рублёў.**

Гутаркі ўрача.

„БАЛОТНАЯ ТРАСЦА“.

Слова **малярыя**—італьянскае, азначае папсаванае паветра, якое бывае ў балоцістых мясцовасьцях. Дапушчэньне, што малярыйная зараза знаходзіцца ў параваньнях, якія ўздымаюцца над балотамі, і дало повад італьянцам празваць гэтую хваробу малярыяй.

У СССР малярыя ў многіх мясцовасьцях носіць назву «балотнай трасцы». Асабліва распаўсюджана гэтая хвароба ў Туркестане, на Каўказе і па берагох Волгі, Чорнага мора, Дняпра, Днястра і Дона.

У Беларусі малярыя зьвіла сабе моцнае гняздо на Мазыршчыне.

Лютуе малярыя ў сырыя гады, часта пасьля доўгіх дажджоў, асабліва калі за імі наступае жаркая пагода. Вялікае распаўсюджаньне малярыі прыкмячаецца таксама ў водных мясцовасьцях: па берагох рэк, мораў, возёр і інш.

Узбудзіцель малярыі быў устаноўлен у 1880 г. французскім урачом **Лаверанам**. Ён знайшоў, што ў хворых малярыяй унутры чырвоных крывяных шарыкаў знаходзяцца драбнейшыя жывыя істоты—паразыты, якія потым атрымалі назву «плазмодзіяў».

Паразыты гэтыя ад хворых перадаюцца здаровым асобай пародай камароў—**анофелес**. Папаўшы ў кроў і пранікнуўшы ў сярэдзіну крывяных шарыкаў, малярыйныя паразыты пачынаюць разьвівацца і памнажацца. Зьяўленьне новых паразытаў і выклікае прыступы трасцы ў хворага.

Але ня трэба думаць, што прыступ трасцы адбываецца зараз-жа пасьля ўкусу. Прыступ адбываецца праз некаторы час пасьля гэтага — праз 7-10 дзён. У гэты прамежак хвароба знаходзіцца ў скрытым стане.

Малярыю можна перамагчы двума шляхамі: ці зьнішчэньнем усіх камароў, ці вылячэньнем начыста ўсіх малярыкаў у дадзенай мясцовасьці. І тая, і другая мера барацьбы нялёгкая.

Колькасьць камароў можна паменшыць праз асушку балотаў, праводзячы мэліорацыйныя работы.

Неабходна таксама ахоўваць у сябе на дварох усякую запасную ваду ў зачыненых зьмяшчальнях, каб камары і тут ня клалі сваіх яек.

Дзеля асабістага забясьпечаньня ад малярыі карысны розныя меры ад укусаў камароў. Сюды адносяцца мэханічныя сродкі—сеткі, якія ўстаўляюцца ў вокны хат, шчыльныя рукавіцы і вуалі на твар, змазаныя вядомай супроцьмалярыйнай вадкасьцю доктара Малініна.

На хвалі 500 мэтраў.

(Менская радыё-станцыя імя Савнаркому БССР).

Сёньня перадаецца наступная програма:—7 г. 00 хв.—гутарка ЦСПСБ — **„Амстэрдамскі Інтэрнацыянал“**; 7.30. — **Радыё-газэта № 175**; 8.15.—Гутарка з хатнімі гаспадынямі **„Кастрычнікавае сьвята у сям'і**; 8.45.—**Трансьляцыя маскоўскіх перадач.**

Заўтра будзе перадавацца: 7.00.—гутарка ўрача—**„Ахова мацярынства і младенцтва у БССР“**; 7.30—**радыё-газэта № 176**; 8.15—**радыё-газэта на мове эспэранто**; 8.45—Гутарка ЦК МОПР—**„Белы тэрор за 1-е паўгодзьдзе 1927-га году і становішча паліт-зьняволеных“**; 9.15—**трансьляцыя маскоўскіх перадач ці концэрт.**

АДКАЗЫ ЧЫТАЧОМ.

А. С. (№ 1113) Вольным слухачом паступіць у профшколу нельга.

Яму-ж. (№ 1114). Перавыбары бюро ячэек пачнуцца ў 20 лічбах кастрычніка.

Х. Едавіцкаму. М. (№ 1115). Чуць лёнданскія радыё-перадачы можна толькі лямпавым прыёмнікам.

М. Васёламу (№ 1116). Пры віцебскім мастацкім тэхнікуме спэцыяльнай падрыхтоўчай мастацкай школы няма.

Вяржбіцкаму С (№ 1117). Стара-Дарожскі раён былой Слуцкай акругі цяпер далучан да Бабруйскай акругі.

Н. Камінскай. (№ 1118). Дописы ў «Чырвоны Сейбіт» трэба дасылаць па адрасе: „Беларуская Вёска“—Менск, Савецкая, 63.

Адказныя рэдактары: { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 1 друкарня БДВ.